№ 28 (338) 1 жніўня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Сакрэтныя перамовы з «Газпромам»

Сам факт, што яны працягваюцца... Старонка 7.



## Уладзімер Някляеў

«І нікога на машынах, каб пылу не ўздымалі...» Старонкі 14—15.

## Вацлаў Малы

Біскуп Прагі ў Рэдакцыі «НН»: «У вас дзіўная дыктатура, у якой шмат дзірак». Старонка 11.

## Лёлік Ушкін

Дзякуй міністру Падгайнаму за ўратаваньне «Навінак». Старонка 2.

# Няўжо нарэшце аб'яднаюцца?

29 ліпеня ў офісе Аб'яднанай грамадзянскай партыі лідэры пяці апазыцыйных партыяў (Партыя БНФ, АГП, БСДГ, працавікі, ПКБ) і дэпутацкая група «Рэспубліка» падпісалі пагадненьне аб каардынацыі дзейнасьці. Гэтае пагадненьне, як мяркуецца, стане асновай стварэньня дэмакратычнае кааліцыі апазыцыйных сілаў.

Умовы пагадненьня прадугледжваюць супольныя дзеяньні ў справе дасягненьня дэмакратычных зьменаў у выбарчым заканадаўстве, падчас выбарчых кампаніяў у прадстаўнічыя органы ўлады ды супраць магчымай спробы кіраўніка дзяржавы пайсьці на трэці тэрмін. Дамова адкрытая для іншых палітычных партыяў і дзейнічае да канца паўнамоцтваў цяперашняга складу палаты прадстаўнікоў.

Падпісаньню пагадненьня папярэднічала гарачая дыскусія, якая цягнулася каля дзьвюх гадзінаў. Вінцук Вячорка і Анатоль Лябедзька вінавацілі «рэспубліканцаў» у імкненьні захапіць лідэрства ў апазыцыйным руху. Аднак Сяргей Скрабец, Валеры Фралоў, Уладзімер Парфяновіч ды Іван Пашкевіч запэўнілі, што на лідэрства не прэтэндуюць. «Партыі былі і будуць, а дэпутацкая група — зьява часовая», — сказаў ачольнік «Рэспублікі» С.Скрабец.

Ужо 12 жніўня будзе падрыхтаваны першы варыянт агульнага сьпісу на выбары. У ім будуць і «рэспубліканцы», і «партыйцы». Хоць на аўторкавай нарадзе прагучала і такое: калі дэпутаты хочуць трапіць у сьпіс, няхай уступяць у якую-небудзь партыю альбо створаць сваю (найбольш пасьлядоўна гэтую прапанову адстойваў Станіслаў Шушкевіч). Сваёй партыі ў бліжэйшы час «Рэспубліка» стварыць не зьбіраецца, уступаць у іншыя партыі яе сябры таксама ня хочуць. Таму ў гэтым пытаньні ўсе бакі пакуль засталіся пры сваіх меркаваньнях.

Ці можна сказаць, што мы сталі сьведкамі нараджэньня будучай дэмакратычнай кааліцыі апазыцыйных сілаў? Пакуль нават удзельнікі падпісаньня па-рознаму ўспрымаюць гэтую падзею. І калі А.Лябедзька ды С.Скрабец такую кааліцыю ўжо бачаць, дык С.Шушкевіч кажа, што «мы вырашылі папросту падтрымаць «Рэспубліку», хоць яна і ня мае пакуль трывалай палітычнай платформы». Тым ня менш, паводле словаў А.Лябедзькі, ужо ў верасьні зьявіцца зварот кааліцыі да выбаршчыкаў. Да таго часу будуць ладзіцца сацыялягічныя апытаньні, адна з мэтаў якіх — выбраць назоў для кааліцыі. Парлямэнцкія выбары 2004 г. могуць стаць першымі з 1990 г., на якія апазыцыя стартуе адзінаю.

**Парлямэнцкія выбары — 2004. Тэма нумару — старонкі 4—6.**



IREX-PROMEDIA

**Гары Паганяйла, Аляксандар Дабравольскі, Сяргей Калякін і Анатоль Лябедзька: паціхеньку, памаленьку...**

## Цынічная насьмешка з гісторыі

**Легендарны архівіст Віталь Скалабан кажа, што тыдзень ня мог працаваць, пасьля таго як яму ў рукі трапілася гэтая кніга. Гэтай кнігі не пабачыш ні ў адной публічнай кнігарні — яна прадаецца толькі па безнаяўным разьліку для навучальных установаў. Кнігу не абмяркоўвалі ў Інстытуце гісторыі, але па ёй будуць выкладаць гісторыю Беларусі. Называецца яна «Гісторыя Беларусі. Дасавецкі пэрыяд», азначана як «навучальны дапаможнік», выйшла ў Магілёве. Яе аўтар — Якаў Трашчанок, былы выкладчык прэзыдэнта ў Магілёўскім унівэрсытэце. Кніга выйшла з грыфам «Дапушчана Міністэрствам адукацыі» — гэта значыць, што дапаможнік лічыцца базавым, а не экспэрымэнтальным. Ад гэтага часу студэнтам пачнуць выкладаць нацыянальную гісторыю «паводле Трашчанка». Дык хто ж такі гэты нікому не вядомы Трашчанок? Што ўяўляе сабой ягоны падручнік? Мы папрасілі адказаць на гэтыя пытаньні гісторыка Генадзя Сагановіча. Старонка 3.**

ГУЧНАЯ СПРАВА

## Акадэмік пад падпіскай

**Крымінальную справу супраць дырэктара Інстытуту цепла- і масаабмену НАН акадэміка Алега Мартыненкі распачаў Камітэт дзяржбясьпекі.** Акадэміка вінавацяць паводле ч.3 артыкулу 210 КК («Раскраданьне ў буйным памеры праз злоўжываньне службовым становішчам»). Навукоўцу пагражае пазбаўленьне волі на тэрмін ад 6 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасьці. «Буйнымі памерамі» ў Беларусі лічацца сумы, большыя за 250 базавых адзінак (каля 1700 даляраў).

23 ліпеня А.Мартыненку дапыталі як сьведку і толькі пасьля таго затрымалі яго як абвінавачванага. Як паведаміў супрацоўнік цэнтру інфармацыі КДБ Ігар Іваноў, цяпер 67-гадовы акадэмік адпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе і знаходзіцца ў шпіталі лечкамісіі, у ягонай кватэры і на лецішчы быў ператрус.

Як паведаміў «НН» адзін з супрацоўнікаў НАН Беларусі, крымінальная справа на А.Мартыненку магла быць інсьпіраваная з прэзыдыюму Акадэміі навук. На мяжы 2002—2003 г. Акадэмію наведаў А.Лукашэнка. У выніку гэтага візыту амаль увесь бюджэт НАНБ на 2003 г. быў разьмеркаваны на Інстытут цепла- і масаабмену, што выклікала зайздрасьць і плёткі. Скептычна паставіўся да гэтай вэрсіі прафэсар Юры Хадыка: фінансаваньне меў праект, якім кіраваў ня ўласна А.Мартыненка.

**Аркадзь Шанскі**

**Даведка «НН».** А.Мартыненка нарадзіўся ў 1936 г. у Краматорску (Украіна). У АН з 1963. У 1991 стаў акадэмікам. Інстытутам цепла- і масаабмену кіруе з 1988.

## На «Альфе» па-беларуску

**З 28 ліпеня штодзённы выпуск навінаў у 15.45 на «Альфа-Радыё» выходзіць па-беларуску.** Пасьля закрыцьця «Сталіцы», «Альфа» стане адзінай FM-станцыяй, якая выкарыстоўвае беларускую мову ў этэры, кажа вядучы Іван Мірскі. У верасьні станцыя пляную пашырыць беларускамоўнае вяшчаньне.

## Забаронена: міны

**Беларусь далучылася да Канвэнцыі аб забароне ўжываньня, назапашваньня, вытворчасьці і перадачы супрацьпяхотных мінаў і аб іх зьнішчэньні.** Ранейшым прэзыдэнцкім указам быў усталяваны мараторый на экспарт супрацьпяхотных мінаў.

**БТ**

# Кніга заснавальніка «НН»

**Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху**: Выбраныя творы. — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2003. — 300 ас.

Творы пачынальніка беларускага руху, ягонага ідэоляга Антона Луцкевіча не былі ні сыстэматызаваныя, ні выдадзеныя зборам твораў у постсавецкі час. Дзяржаўныя ўстановы з зусім пэўных меркаваньняў гэтым не займаюцца. Кніга, укладзеная Анатолем Сідарэвічам, часткова запаўняе прабел. У выданьне ўвайшлі артыкулы 1909— 1939 г., прысьвечаныя ідэалёгіі ды гісторыі нацыянальнага руху. Цікавым дадаткам да твораў выглядаюць малавядомыя паказаньні А.Луцкевіча, арыштаванага НКВД. Нікога не агаварыўшы, нікога не павёўшы за сабою ў ГУЛАГ, А.Луцкевіч праз свае паказаньні здолеў пераканаць людзям патомным тое, чаго не пасьпеў напісаць і надрукаваць на волі.

Прыняўшы НКВДысцкія правілы гульні і тэрміналёгію, ён зафіксаваў гісторыю і пастуляты нацыянальнага руху.

Правапіс выданьня клясычны. Прадмова А.Сідарэвіча аднаўляе кантэкст, у якім жыў і пісаў А.Луцкевіч, камэнтары вылучаюцца выключнаю паўнатою.



Лёлік Ушкін

# Дзякуй міністру Падгайнаму за ўратаваньне «Навінак»




IREX-PROMEDIA

**Паўлюк Канавальчык (у цэнтры) на пэрформансе «Навінак», 2003 г.**

**Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі апошніх гадоў паступова выпрацавалі ў ахвяраў рэжыму карпаратыўную этыку паводзінаў. Яна абсалютна не падобная да паводзінаў палітзэкаў часоў архіпэлягу Гулагу. Пэрсанажы Салжаніцына і Шаламава, пабачыўшы «корачкі» опэраў НКВД, спрабавалі адмазацца: енчылі аб тым, што адбылася трагічная памылка, што яны ня вінныя, што ўсімі фібрамі душы шануюць бацьку народаў.**

У асяродзьдзі сучасных беларускіх «вязьняў сьвядомасьці», наадварот, прынята дэманстраваць глыбокую абыякавасьць і пагарду да ўладаў, пры магчымасьці — нават зьдзекавацца зь іх. Провады рэдактара «Рабочага» Івашкевіча на «хімію» нагадваюць провады зімы. Пастанова аб судзімасьці апазыцыянэра падобная да сьвята чыноўніка, які атрымаў ганаровую грамату. Сьмех, жарты, песьні, бухач...

На гэтай глебе «Навінкі», якія сёньня ў судовых цяжбах адстойваюць права на ліцэнзію аб друку, пераплюнулі нават Шчукіна. Апошні, паміж партыямі ў мандавошку на Акрэсьціна, патрабаваў выдаць яму мяцёлку, каб навесьці ў турме чысьціню. Паўлюк Канавальчык, галоўны рэдактар «Навінак», тыдзень, што папярэднічаў разгляду скаргі на Міністэрства інфармацыі ў Гаспадарчым судзе, правёў на Нарачы, у Кабыльніку, дзе непрабудна квасіў. У апатэозе адпачынку, пад мухай, ён паехаў катацца на ровары ўздоўж мясцовага пляжу і пераехаў турыстаў. Адбыўся канфлікт, які скончыўся тым, што Канавальчыку далі бутэлькай па галаве.

Інцыдэнт на кабыльніцкай рыўеры сёньня займае супрацоўнікаў «Навінак» куды больш, чым вынікі судовага працэсу ў Гаспадарчым судзе. Судовае паседжаньне 23 ліпеня, як і чакалася, стала фармальнасьцю, нават нягледзячы на камічнасьць аргумэнтаў Міністэрства інфармацыі. Чыноўнікі спрабавалі давесьці, што газэтныя артыкулы, дзе згадваюцца словы «ж..а» і «адсасаць», парушаюць годнасьць «грамадзянаў». Усё як у старой расейскай показцы. Вар'ят крычаў «Дурак». Паліцыянт арыштаваў яго, аргумэнтуючы свае паводзіны словамі: «Мы ведаем, хто ў нас дурак».

Для рэдакцыі «Навінак» забарона — ня самае жудаснае. У адрозьненьне ад «БДГ», у «Навінак» ёсьць досьвед «самвыдатаўскай» працы. Нашмат горшым варыянтам была, дарэчы, абсалютна рэальная на пачатку вясны пэрспэктыва ціхага заняпаду праекту з тае самае прычыны, зь якой год назад дала дуба «Беларуская маладзёжная» — з-за дэфіцыту грошай. «Навінкі» за пяць гадоў існаваньня ператварыліся ў артыстычны прытон, куды прыходзяць эльфы, музыкі, трансвэстыты, панкі, этнарадыкалы, літарбалісты, міліцыянты і нават мілітанты руху «Сумленьне Курапатаў», якія скардзяцца, што Вячорка і Высоцкі забараняюць ім піць у лягеры гарэлку. Сфармавалася субкультурнае гета, якому больш пагражаюць не фармальныя пастановы Падгайнага, а страта «Навінкамі» сымбалічнага капіталу, іміджу самай крутой альтэрнатыўнай тусоўкі. Ваколнавінкаўская багема не зразумела б сьмерці канторы зь фінансавых прычын. Сп.Падгайны з сваімі цыркулярамі аб забароне выратаваў праект. Дзякуючы ўладам, «Навінкі» атрымалі скандал і шум у прэсе — калёры, неабходныя для стварэньня свайго «навінкаўскага міту».

У падручніках гісторыі Беларусі сярэдзіны гэтага стагодзьдзя міт пра «Навінкі» павінен гучаць прыкладна так: «Пры канцы ХХ стагодзьдзя ў анархічным андэрграўндзе быў створаны праект «Навінкі», які можна параўнаць з рухам футурыстаў, міцькоў або дадаістаў. У 2003 г. дзеля свайго «бязьлітаснага» гумару газэта зазнала суровых рэпрэсіяў з боку дыктатарскай ахранкі. У якасьці падставы для забароны «Навінкам» інкрымінавалася выкарыстаньне слова «жопа». У 2003 г. супраць газэты была ўзбуджаная судовая справа. З часоў Казімера Лышчынскага, які напісаў трактат «Аб неіснаваньні Бога», за што пайшоў на вогнішча інквізыцыі, Беларусь ня ведала працэсу над гумарыстычнай прэсай. Нягледзячы на міжнародную кампанію салідарнасьці ( гл. Ратэрдамскую рэзалюцыю ПА АБСЭ, праграму «Намедні» (НТВ), газэта была зачыненая. Аднак гэта толькі дадало праекту скандальнай папулярнасьці і забясьпечыла новы прызыў адэптаў з маладзёвага асяродзьдзя. Калектыў з новай энэргіяй пачаў здымаць фільмы і цёлак, вясяліцца, будуючы падмурак незалежнай культуры Беларусі».

Ва ўсёй гэтай гісторыі шкада толькі бацькоў Паўлюка, у якіх з-за фокусаў нашчадка зьбіраюцца апісаць маёмасьць.



ВЭРАНІКА ДЗЯДОК

**26 і 27 ліпеня адбыліся дзясяткі мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня Незалежнасьці. Хоць у гэтыя два дні і абвяшчалася пра стварэньне кааліцый ды кааліцыяў кааліцый, сьвяткавалі апазыцыянэры ў асноўным незалежна адзін ад аднаго.**

Аляксей Шэін

# Сьвята не без адрэналіну

26 ліпеня Народная Грамада зладзіла міжнародную канфэрэнцыю да стагодзьдзя Беларускай сацыялістычнай грамады і 13-й гадавіны Незалежнасьці. Узровень дыскусіі даваў зразумець, што міжнародны сацыял-дэмакратычны рух перажывае крызіс ідэяў.

У гэты ж дзень Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ усталявала ў Курапатах сорак новых крыжоў уздоўж кальцавой аўтадарогі.

27 ліпеня дэпутаты Вярхоўных Саветаў 12 і 13-га скліканьняў, чальцы групы «Рэспубліка» ды прадстаўнікі створанай увесну Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў правялі сьвяточную вечарыну. Камэрнае мерапрыемства праходзіла ў менскай кавярні «Еляана». Выступаючы на сьвяткаваньні, Станіслаў Шушкевіч сказаў, што, на яго думку, адна з прычынаў прыходу ў 1994 г. да ўлады Лукашэнкі — тое, што «ВС 12-га скліканьня занадта хутка працаваў над прыняцьцем Канстытуцыі». На думку іншага сьпікера, Мечыслава Грыба, адмоўную ролю ў нашай далейшай гісторыі адыграла тое, што «падзеі ціхай рэвалюцыі» не суправаджаліся ўсеагульным абнаўленьнем улады, у структурах якой засталіся кіраўнікі з былой савецкай намэнклятуры. Прыстасаваўшыся да новых умоваў і выкарыстаўшы сваё службовае становішча падчас перападзелу нацыянальнага багацьця, яны цяпер моўчкі пагаджаюцца з усім, што творыцца ў нашай краіне». Яшчэ адна праблема — у пачатку 90-х кіраўніцтва краіны ня мела адзінае думкі пра тое, як Беларусь будзе будаваць незалежнае жыцьцё і якія абіраць прыярытэты.

Арганізатары сустрэчы вырашылі сумясьціць прыемнае з карысным і проста ў кавярні падпісаць пагадненьне аб супрацы паміж «Рэспублікай» і Асамблеяй дэпутатаў мясцовых саветаў. У выніку каардынатар «Рэспублікі» Сяргей Скрабец подпіс паставіў, а каардынатары Асамблеі — пакуль ня ўсе.

У гэты ж дзень на сьвяточным паседжаньні ЦК БСДП (НГ) было дэклараванае стварэньне Эўрапейскай кааліцыі, а пасьля, а 14-й, у Купалаўскім сквэры актывісты партыі ўсклалі кветкі да помніка паэту. Сабралося каля 40 чалавек. Да акцыі далучыліся прадстаўнікі «Маладога фронту», якія наладзілі пікет пад лёзунгам «Я люблю Беларусь!». Затрыманых не было, у адрозьненьне ад акцыі «зуброў», якая прайшла а 12-й на пляцы Незалежнасьці. На выхадзе з Чырвонага касьцёлу зуброўцы сталі з расьцяжкай «Жыве незалежная Беларусь!» і раздавалі ўлёткі-віншаваньні. Міліцыя затрымала некалькі актывістаў, а таксама сябра КХП-БНФ Рыгора Кійка, што якраз выходзіў з касьцёлу і вырашыў абараніць хлопцаў.

Сьвяткавалі Дзень Незалежнасьці і ў Празе. У адным з самых прэстыжных клюбаў «№11» у цэнтры чэскай сталіцы сабраліся прадстаўнікі беларускіх эміграцыйных арганізацыяў і чэскія палітыкі. На ўваходзе ў клюб віселі два велізарныя сьцягі: беларускі нацыянальны й чэскі дзяржаўны.

Гарадзенскія апазыцыйныя арганізацыі сустрэлі трынаццатую гадавіну Незалежнасьці вывешваньнем на высотных дамах у розных пунктах гораду бел-чырвона-белых сьцягоў. Усяго іх было пяць. Два сьцягі нараніцу 28-га яшчэ луналі над местам.

Бел-чырвона-белыя сьцягі былі ўзьнятыя і ў Барысаве. Мясцовыя зуброўцы вывесілі іх у трох раёнах гораду. А ў Маладэчне адзін зь сьцягоў зьявіўся насупраць гарвыканкаму.

Барысаўскія «зубры» зладзілі й футбольны турнір на «Кубак незалежнасьці». За ўзнагароду 26—27 ліпеня змагаліся каманды з Гомелю, Барысава, Маладэчна, Магілёва, Менску ды Смалявічаў. Перамаглі гаспадары.

Галоўны ж футбольны турнір адбыўся ў Менску 27 ліпеня. Змаганьне за «Кубак Свабоды імя Генадзя Карпенкі» стала самым кааліцыйным сьвяткаваньнем гадавіны Дэкларацыі. Гулялі чатыры каманды апазыцыйных партыяў (БНФ, АГП, БСДП (НГ), ПКБ) і каманда журналістаў. Каманда журналістаў запомнілася добрай і стабільнай гульнёй, а каманда Партыі БНФ — стабільным расейскім матам, які не шкадаваў вушэй дзетак, што прыйшлі паглядзець на турнір. Кубак атрымалі журналісты.

Штогод, адкрываючы гэты традыцыйны ўжо турнір, палітыкі казалі: «Налета будзем гуляць на «Дынама»! Гэтым разам вырашылі прамаўчаць.

# У Ліцэі пачынаецца вахта




АРЦЁМ ЛЯВА

Абаронцы ліцэю зноў вярнуліся да вулічных акцыяў. 29 ліпеня навучэнцы з бацькамі прыйшлі да будынку гарадзкога камітэту адукацыі, куды чыноўнікі выклікалі бацькоў па адным. Да зьяўленьня цэлай дэлегацыі супрацоўнікі ГарКА не былі падрыхтаваныя. Кіраўнік камітэту Міхаіл Ціцянкоў адмовіўся зь ёю сустрэцца. У прыёмнай чыноўніка бацькі спаткалі вядомую спн.Шчарбачэвіч — на сустрэчу зь ёй Ціцянкоў час знайшоў.

Тым часам настаўнікі Гуманітарнага ліцэю пачалі атрымліваць поштаю запрашэньні ў гарадзкі камітэт адукацыі, дзе ім меліся б прапанаваць працу. Не даслалі запрашэньняў, як кажа Лявон Баршчэўскі, выкладчыкам, што дасягнулі пэнсійнага веку (іх у штаце НДГЛ было блізу паловы), і адміністрацыі навучальнай установы. На сходзе калектыву 28 ліпеня настаўнікі даручылі выступаць ад іх імя перад чыноўнікамі Ўладзімеру Коласу.

Настаўнікі, ліцэісты й бацькі не пачуваюцца самотнымі ў сваім змаганьні. На арганізацыйны сход грамадзкага камітэту ў абарону ліцэю, што адбыўся 28 ліпеня, прыйшлі іх падтрымаць Уладзімер Арлоў, Валеры Мазынскі, Мікола Купава, Уладзімер Парфяновіч і інш. Грамадзкі камітэт мае каардынаваць дзейнасьць усіх зацікаўленых у дзейнасьці ліцэю — як у Беларусі, так і па-за ёй.

Асноўная задача, якая сёньня стаіць перад абаронцамі, — захаваць будынак па вул.Кірава, 21. Цягам бліжэйшага тыдня яго мусяць перавесьці на баланс гораду, пасьля чаго ў кожны момант можна чакаць пачатку даўно абяцанага рамонту. Ні настаўнікі, ні бацькі ў яго праўдзівасьць ня вераць. «Прыедуць будаўнікі, насыплюць кучу пяску перад уваходам, выб'юць шыбы ды сьцены павымазваюць. А потым скажуць, што грошай няма. Так мы застанемся і без настаўнікаў, і без будынку», — казалі бацькі на сходзе. Каб не застацца на пачатку навучальнага году на вуліцы, было вырашана дзяжурыць у ліцэі дзень і ноч. Калі пачнецца вахта, пакуль няясна. Л.Баршчэўскі лічыць, што варта пачакаць першага наведаньня будаўнікоў, а Вінцук Вячорка настойвае, што трэба пачынаць ужо цяпер.

Бацькі ж тых ліцэістаў-першакурсьнікаў, што вучыліся на падрыхтоўчых курсах, маюць падаваць у суд на Міністэрства адукацыі: «Мы плацілі грошы, каб нашых дзяцей падрыхтавалі для паступленьня ў НДГЛ. Праз загад Мінадукцыі гэтая ўстанова ліквідаваная, а нашыя грошы ляснулі».

Змаганьне трывае.

**Аркадзь Шанскі**

## Лукашэнкаўцы выпусьцілі падручнік гісторыі, які адмаўляе самастойнасьць беларускае нацыі

# Цынічная насьмешка з гісторыі




Працяг са старонкі 1.

**«НН»: Шырока вядома, што Якаў Трашчанок выкладаў гісторыю А.Лукашэнку. А што яшчэ можна сказаць пра гэтую асобу?**

**Генадзь Сагановіч:** У 1965 г. Мікола Прашковіч, таленавіты беларускі літаратар, адазваўся рэцэнзіяй на кніжку Коршунава пра Апанаса Філіповіча. Не пабаяўся сказаць, што ВКЛ не было такой ужо літоўскай дзяржавай, як здавалася Коршунаву, бараніў Унію, няўхвальна выказваўся пра расейскае праваслаўе... Не пасьпеў Прашковіч гэта апублікаваць, як у газэце «Советская Белоруссия» зьявіўся допіс двух асьпірантаў БДУ, адным зь якіх быў Я.Трашчанок. Афармлялася гэта ўсё як ліст у рэдакцыю, але насамрэч было палітычным даносам. Той пагромны допіс называўся «Вопреки истине». Аўтараў допісу раздражніла тэза, што Беларусь гістарычна мела сваю дзяржаўнасьць. «Толькі Вялікая кастрычніцкая рэвалюцыя дала Беларусі дзяржаўнасьць», — пісалі пільныя асьпіранты. Яны не пагаджаліся і з тым, што Унія магла мець нейкую станоўчую ролю для Беларусі: праваслаўе і толькі праваслаўе! І ўжо тады Трашчанок папросту падтасоўваў факты. Напрыклад, ён казаў: «М.Прашковіч даказвае, што Вялікае Княства было толькі беларуска-ўкраінскай дзяржавай», хаця Прашковіч такога не пісаў. Альбо: «Прашковіч піша, што Ягайла і Вітаўт заўжды гаварылі па-беларуску», хоць і гэтага ў Прашковіча няма... Адным словам, адразу выявілася нячыстасьць мэтадаў, усё дзеля таго, каб ачарніць апанэнта.

Потым доўгі час яго ніхто ня бачыў і ня чуў: асьпірантуру ён, відаць, скончыў, але кандыдацкай не абараніў. Ніхто ня бачыў і ягоных навуковых публікацыяў.

**«НН»: На якіх пазыцыях стаіць аўтар падручніка: беларускіх, савецкіх, расейскіх?**

**Г.С.:** Гэта «заходнерусізм», даведзены да паталягічнай крайнасьці. Праўда, крыху мадыфікаваны, бо цяпер у набор культавых каштоўнасьцяў уключаецца і савецкая ўлада. Галоўны пастулят «заходнерусізму» там відавочны: поўнае непрыманьне беларусаў як самастойнага народу і разгляд Беларусі як часткі Расеі. На думку Трашчанка, беларусаў і расейцаў быццам спрадвеку яднаюць праваслаўе і «руская мова». Як і «заходнерусы», ён ненавідзіць каталіцтва і ўсё заходняе. У гэтым сэнсе вяртаньне «заходнерусізму» відавочнае. Але калі, напрыклад, ідэоляг «заходнерусізму» М.Каяловіч прызнаваў гістарычную адметнасьць беларусаў, дык Трашчанок не пагаджаецца нават на гэта.

**«НН»: Як можна акрэсьліць навуковы стыль кнігі?**

**Г.С.:** Яго папросту няма, бо аўтар не спрабуе ўзьняцца над эмоцыямі. Тэкст насычаны абразамі — у бок апанэнтаў, у бок «ворагаў» — беларускіх «нацыянал-радыкалаў», каталіцкай шляхты і Захаду. Тых, хто прыняў каталіцтва, ён называе не іначай як рэнэгатамі. Ён піша, што польскай шляхце ўласьцівыя «лизоблюдство, спесь, продажность», што шляхцянкі прыяжджалі на балі ў празрыстых сукенках на голае цела і дазвалялі прылюдна цалаваць свае грудзі. На добры лад, за падобныя абразы і распальваньне нацыянальнай варожасьці падаюць у суд. А гэта ў падручніку!

Паводле стылю гэта не падручнік, не літаратура для навучаньня. Гэта нават не памфлет, а цяжка сказаць што. Страшэнная мешаніна! У падручніку звычайна спакойна выкладаецца квінтэсэнцыя ведаў. Тут жа ў зьмесьце пануе маралізацыя, выкрываньні і павучаньні. Трашчанок быў загадзя ўпэўнены: прымуць усё, што б ён ні напісаў. Таму і ўзьнік гэты мэнтарскі тон. А там, дзе аўтар бярэцца асьвятляць важныя тэмы, адразу адчуваецца навуковая бездапаможнасьць: часам на адной старонцы — дзясяткі памылак. Можна бясконца цытаваць ня проста недакладнасьці, а прыклады няведаньня навуковых фактаў, фальсыфікацыі і падтасоўкі...

**«НН»: Напрыклад?**

**Г.С.:** Трашчанок вінаваціць гісторыкаў-«нацыяналістаў» у выдумляньні «нацыянальных беларускіх княстваў» у XII ст., але ў нас ніхто і не называе першыя дзяржавы Беларусі «нацыянальнымі беларускімі». Піша, быццам «адраджэнцы» атаесамляюць «сучасных беларусаў з крывічамі», што няпраўда. Кажа, што паўстаньне 1863 г. «наіўныя» радыкалы выдаюць за «сялянскі выступ», але і гэта няпраўда! Падтасоўкі, якія дапамагаюць паказаць апанэнтаў дурнямі. Паводле Трашчанка, старажытнаруская дзяржава ніколі не развальвалася на асобныя княствы, хоць у гістарыяграфіі добра дасьледаваны працэс яе распаду. Крэўская унія, якая заключалася быццам для захопу зямель Русі літоўскімі фэадаламі, прынесла «неисчислимые страдания белорусскому народу»! Люблінская унія стала яшчэ большай бядой. А Берасьцейскую царкоўную унію, «проклятую народом», быццам уводзілі «огнём и мечём»... Нейкі кашмарны сон, які ня мае нічога супольнага з гістарычнай рэальнасьцю. Альбо яшчэ: Трашчанок зводзіць этнічную сьвядомасьць да рэлігіі. Але калі б у Заходняй Эўропе нацыі фармаваліся такім чынам, дык колькі б там было дзяржаваў?! А як можна расцэньваць такую тэзу: калі беларуская мова выкарыстоўвалася для прапаганды каталіцызму, дык гэта надавала ёй «антыбеларускі характар»!? Проста да сьмешнага тэндэнцыйна асьвятляюцца антырасейскія паўстаньні. Маўляў, сяляне спрэс мелі манархічныя настроі, а паўстанцы былі настолькі хітрыя і каварныя, што — уяўляеце? — нападалі на царскіх салдатаў, якія «мірна спалі ў казармах». Калі б гэта суаднесьці з партызанамі другой сусьветнай вайны...

**«НН»: Выданьне выклікала ў Вас буру эмоцыяў...**

**Г.С.:** Хутчэй горкую ўсьмешку. «Заходнерусізм» зьнік з утварэньнем БССР: ён страціў сваю актуальнасьць і быў забыты. А цяпер мы маем справу зь ягонай рэінкарнацыяй. Самае прыкрае, што па гэтай кнізе студэнтаў будуць вучыць гісторыі. Ані выкладчыкі гісторыі, ані навукоўцы па-новаму адразу пасьля выхаду гэтай кнігі думаць ня стануць, а вось студэнтаў — шкада... Да апошняга часу ў мяне была ўпэўненасьць, што нашая гістарычная навука ўжо трывала стаіць на навуковай аснове. Але гэтая кніга — аплявуха ўсёй супольнасьці гісторыкаў, гэта папросту цынічная насьмешка.

**«НН»: Як адказвае Я.Трашчанок на навуковыя працы апошняга дзесяцігодзьдзя?**

**Г.С.:** Мяне ўразіла, што пераважна падаюцца навуковыя зьвесткі 1960-х: ідуць спасылкі на савецкія кніжкі пачатку 70-х. Ягоныя веды засталіся на ўзроўні, які ён атрымаў падчас навучаньня ў асьпірантуры. Праўда, у сьпісе літаратуры ёсьць і новыя выданьні, але відавочна, што Я.Трашчанок іх не чытаў. Студэнтаў чакае столькі «адкрыцьцяў»! Напрыклад, яны даведаюцца, што Літоўскае княства ўзьнікла ў XII ст. у Чорнай Русі, хоць па гэтай праблеме выйшла шмат дасьледаваньняў. Што Турава-Пінская зямля ніколі не была самастойнай, хаця ёсьць працы Лысенкі, дзе даўно ўжо даказана процілеглае. Што акту Крэўскай уніі няма і яго пераказвае толькі Длугаш, хоць гэты акт неаднаразова выдаваўся і аналізаваўся. І ўжо зусім асаблівыя веды Трашчанка па гісторыі адносін Беларусі з Расеяй. Праз усю гісторыю ён бачыць толькі «типичное для белорусских земель тяготение к великорусскому центру». Без падмацаваньня фактамі. Заснаваныя на канкрэтных прыкладах довады апанэнтаў Я.Трашчанок упарта называе «гульнёй у факцікі». Але сваіх прыкладаў, якія б абвяргалі тое, што ён называе «факцікамі», Трашчанок не падае.

**«НН»: Чаму падручнік Трашчанка зьявіўся менавіта цяпер?**

**Г.С.:** Я ня бачу нейкай канкрэтнай прывязкі да навучальных гадоў: такі падручнік мог зьявіцца і два гады таму, і тры... Хутчэй за ўсё, замова на яго была пададзеная яшчэ ў 90-я. Мне падаецца, што Трашчанок проста па-гультайску працаваў. Нават гэты прадукт, які нарэшце ўбачыў сьвет, выклікае зьдзіўленьне сваёй неахайнасьцю.

**«НН»: Наколькі гэтую кнігу можна параўнаць зь іншымі гістарычнымі падручнікамі, якія выйшлі за часамі Лукашэнкі: Загарульскага, Новіка і Марцуля?..**

**Г.С.:** Нават тыя падручнікі пры ўсёй іхнай тэндэнцыйнасьці мелі нейкі беларусацэнтрызм, а ў гэтым – рабская адданасьць суседу і ганьбаваньне свайго мінулага.

**«НН»: А як ставяцца нашыя навукоўцы да зьяўленьня гэтай кнігі? Мне распавядалі, што падручнік прыйшоў на рэцэнзію на гістарычны факультэт БДУ, дзе атрымаў адмоўны водгук. Тады зь Міністэрства адукацыі «націснулі» — і другі водгук быў ужо «правільны»...**

**Г.С.:** На жаль, навукоўцы рэагуюць моўчкі. Мы ў Інстытуце гісторыі даведаліся, што ў нашай установе адбываецца абмеркаваньне гэтай кнігі, толькі з інтэрвію выканаўцы абавязкаў дырэктара Мікалая Сташкевіча. Бачылі і чыталі рукапіс кнігі толькі некаторыя загадчыкі аддзелаў. Такая ж сытуацыя была і на гістфаку БДУ, хоць рэцэнзію там прымалі быццам калектыўна. Навукоўцы баяцца начальства...

Але для мяне больш дзіўна, чаму міністар адукацыі, гісторык паводле прафэсіі, даў згоду на гэтае выданьне.

**«НН»: Як цяпер навукоўцы будуць ставіцца да навуковых працаў самога Брыгадзіна?**

**Г.С.:** Гэтае выданьне падарвала ягоны аўтарытэт як навукоўца. Да яго цяпер ня будзе даверу: Брыгадзін-чыноўнік разбурыў навуковую рэпутацыю Брыгадзіна-гісторыка.

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**





АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Генадзь Сагановіч:** «Брыгадзін-чыноўнік разбурыў навуковую рэпутацыю Брыгадзіна-гісторыка».

## Гэтак зараз будуць вучыць ва ўнівэрсытэтах:

с.133. ...падставаў ператвараць В.Каліноўскага ў «нацыянальнага героя беларускага народу» не існуе. Гэта тыповы нацыянал-экстрэмісцкі міт.

с.133. Слынны генэрал М.Мураўёў быў ня толькі «вешальнік», але і таленавіты адміністратар...

с.146. Не на каталікоў і праваслаўных раскалоўся беларускі этнас, а на беларусаў і рэнэгатаў-небеларусаў.

с.150. Пры канцы XIX ст. у Беларусі зьявіліся людзі, апантаныя нацыянальнай ідэяй. ... Усё гэта былі буры нават ня ў шклянцы — у лыжцы вады.

# Няўжо нарэшце аб’яднаюцца?



**Парлямэнцкія выбары адбудуцца больш чым праз год, але ўжо сёньня апазыцыйныя палітычныя сілы інтэнсіфікавалі кансультацыі з мэтаю выйсьці на старт адзіным апазыцыйным сьпісам.**

З аднаго боку, аформілася кааліцыя пяці апазыцыйных партый, якая складаецца з Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі, Партыі працы Аляксандра Бухвостава, Сацыял-дэмакратычнай грамады Станіслава Шушкевіча і Партыі камуністаў Сяргея Калякіна. Да гэтай кааліцыі далучаюцца шматлікія палітызаваныя няўрадавыя арганізацыі, якія маюць на месцах болей актывістаў, чым партыі. З другога боку, меншая частка мясцовых і нацыянальных НДзА гуртуецца вакол дэпутацкай групы «Рэспубліка» і «рэспубліканскага» руху «За годнае жыцьцё». У «пяцёркі» ёсьць структуры і практыка апазыцыйнае дзейнасьці, у «рэспубліканцаў» — дэпутацкі статус. Вакол «Хартыі’97» узьнік блёк радыкальнае апазыцыі «Свабодная Беларусь». У гэтых няма ні статусу, ні структураў, затое шмат энэргіі і яркія лідэры-дысыдэнты.

Як заўжды, стратэгія затуляе сабой тактыку ў Зянона Пазьняка і ягонай Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ. Амбітную, не да канца зразумелую гульню вядзе Мікола Статкевіч, лідэр «Народнае грамады».

## «Пяць» плюс «Рэспубліка»

Дэпутацкая група «Рэспубліка» ўжо другі год пазыцыяуе сябе з апазыцыяй. Аднак яе спробы дасягнуць лідэрства ў апазыцыйных колах ня мелі посьпеху. Прадстаўнікі старых партый неаднаразова давалі зразумець «рэспубліканцам», што яны мусяць ведаць сваё месца ў агульным фронце, а не цягнуць коўдру на сябе. Урэшце дэпутаты з гэтым пагадзіліся.

Да таго «Рэспубліка» самаўпэўнена кідалася на не зусім прадуманыя акцыі, як, напрыклад, збор подпісаў за зьмены ў выбарчым заканадаўстве. Было заплянавана сабраць за два месяцы 400—500 тыс. подпісаў. «Мы не баімся гэтай лічбы», — кажа сябра аргкамітэту руху «За годнае жыцьцё» Міхаіл Марыніч. Але кіраўнік «Рэспублікі» Сяргей Скрабец прызнаўся карэспандэнту «НН»: ня ўсе ягоныя паплечнікі вераць, што столькі подпісаў будзе сабрана. Анатоль Лябедзька ў адным з інтэрвію адзначыў, што «партыі гатовыя актыўна ўдзельнічаць у кампаніі, пры ўмове, што ініцыятыўная група будзе зарэгістраваная». У гэтым выпадку была б гарантыя, што подпісы зьбіраюцца не дарэмна і справу давядуць да канца. Тым часам, у зборы подпісаў «Рэспубліцы» ўжо дапамагае ПКБ. Дарэчы, Партыя камуністаў ужо вызначыла больш за 60 чалавек, гатовых ісьці на выбары. А вось у БНФ адмовіліся паведаміць папярэднюю лічбу кандыдатаў, спаслаўшыся на канфідэнцыйнасьць інфармацыі.

29 ліпеня паміж «пяцёркай» апазыцыйных партый і групай «Рэспубліка» было падпісанае пагадненьне аб сумеснай дзейнасьці. «Мы накіруем нашы намаганьні на стварэньне агульнага сьпісу. Спадзяемся, што ўсе дэмакратычныя сілы далучацца да яго», — кажа С.Скрабец. Напярэдадні падпісаньня пагадненьня кіраўнічка Выбарчага штабу БНФ Галіна Сямдзянава выказала карэспандэнту «НН» сваю ўласную думку: умовай уключэньня «рэспубліканцаў» у сьпіс можа стаць іх уступленьне ў адну з партыяў «пяцёркі». Паўстала гэтае пытаньне і падчас нарады ў аўторак. «Мы выступаем за тое, каб яны («рэспубліканцы» — А.Т.) былі ў агульным сьпісе. Іх жа няшмат — чалавек 5-6. Магчыма выхад у тым, каб нейкая партыя за іх паручылася», — так пракамэнтаваў сытуацыю Анатоль Лябедзька. Нягледзячы на тое, што Партыя БНФ падпісала пагадненьне з групай «Рэспубліка», яно яшчэ мусіць быць зацьверджана партыйным Соймам. А на ім могуць узьнікнуць дыскусіі.

## У рамках сваіх партый

У бліжэйшы час чакаецца, што пагадненьне пра супрацу з «Рэспублікай» падпіша і Асамблея дэпутатаў мясцовых саветаў. Пасьля перамогі некалькіх дзясяткаў кандыдатаў ад апазыцыйных палітычных партыяў на мясцовых выбарах многія зь пераможцаў пачалі думаць пра свой удзел і ў парлямэнцкіх выбарах. Гэта пераважна маладыя людзі. Яны здабылі ўпэўненасьць у сваіх сілах і каштоўны досьвед палітычнай барацьбы. Хоць выйграць наступныя выбары будзе значна цяжэй.

Меркаваньні пра тое, што дэмакратычныя дэпутаты мясцовых саветаў могуць пайсьці на парлямэнцкія выбары як самастойная палітычная сіла, аказаліся беспадстаўнымі. Згаданая вышэй Асамблея дэпутатаў мясцовых саветаў стваралася намаганьнямі некалькіх партыяў — у рамках сваіх партый і пойдуць на выбары дэпутаты. Такое меркаваньне выказаў сустаршыня Асамблеі і кіраўнік Менскай абласной арганізацыі БНФ Алесь Міхалевіч. «Большасьць з гэтых дэпутатаў, калі яны захочуць балятавацца ў парлямэнт, маюць вельмі вялікія шанцы выйграць», — мяркуе ён.

## Гульня Статкевіча

БСДП (НГ) ужо даўно заяўляла, што разглядае парлямэнцкія выбары як падрыхтоўку да выбараў прэзыдэнцкіх. Пасьля таго як улады масава чынілі перашкоды кандыдатам ад «Народнай грамады» на мясцовых выбарах, няма веры, што такога прэсынгу ня будзе на выбарах парлямэнцкіх. Дый за што змагацца — за месца ў бяспраўнай палаце прадстаўнікоў? Няма ў партыйцаў веры ў магчымасьць зьмены выбарчага заканадаўства. Таму ўсе сілы і рэсурсы БСДП (НГ) вырашыла скіраваць на падрыхтоўку да прэзыдэнцкіх выбараў. Летам 2003-га было агучана, што партыя вылучыць на гэтыя выбары свайго кандыдата, якім, зразумела, стане Мікола Статкевіч. Пра ягоныя прэзыдэнцкія амбіцыі вядома даўно, але зусім ня факт, што ён адэкватна ацэньвае свае шанцы на перамогу.

На парлямэнцкія выбары БСДП (НГ) папярэдне плянавала выставіць 78 кандыдатаў. Цяпер кажа пра 60. Ужо ў канцы гэтага году яны распачнуць папярэднюю кампанію, хоць партыйнае кіраўніцтва мяркуе, што рэгістрацыю пройдзе ня больш за 30 чалавек.

Партыя Статкевіча трымаецца воддаль ад наваствoранай кааліцыі ды заяўляе, што гаварыць пра кааліцыі за год да выбараў зарана. Маўляў, цяпер трэба працаваць над умацаваньнем партыйных структураў, а не канцэнтравацца на міжпартыйных кантактах. БСДП (НГ) можа далучыцца да «пяцёркі» пры ўмове, што туды возьмуць і яе хаўрусьніцу — Партыю жанчынаў Надзеі Матусевіч. Для астатніх апазыцыйных партый гэта непрымальна, бо рэанімацыя гэтай партыі адбылася пры ўдзеле ўладаў.

Тым часам БСДП (НГ) высоўвае яшчэ адну ўмову — фінансавую празрыстасьць. Прычым гэтае патрабаваньне скіраванае не да кандыдатаў ад уладаў, а да кандыдатаў ад апазыцыі. Прыгадваецца нядаўняе інтэрвію М.Статкевіча БТ, дзе ён распавядаў, як кепска, што беларускія партыі фінансуюцца з-за мяжы, бо спонсары дыктуюць ім умовы гульні. На думку апазыцыі, гэта дэмагагічныя заклікі, бо ва ўмовах, калі апазыцыйная дзейнасьць фактычна загнаная ў падпольле, ніводзін дабрадзей не пагодзіцца ахвяраваць на партыю, калі будзе ведаць, што ягонае імя і назва ягонай фірмы зараз жа стануць вядомыя спэцслужбам, а значыць, назаўтра на прадпрыемстве можна чакаць праверкі з падатковай службы, санстанцыі і Камітэту дзяржкантролю. Навошта вылучаць умовы, якія заведама немагчыма выканаць бяз шкоды для дзейнасьці, абураюцца на сядзібе? 





АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Лідэры руху «За годнае жыцьцё» Тацяна Процька, Сяргей Скрабец і Валеры Фралоў унесьлі ажыўленьне ў палітычны працэс.**

АСАБЛІВАЕ МЕРКАВАНЬНЕ

## Палаткі можа ня быць

**Намесьнік старшыні Кансэрватыўна-хрысьціянскае партыі БНФ Сяргей Папкоў:**

— Пра якія выбары сёньня можна гаварыць? У якую палату? Першачарговая задача сёньня — гэта займацца байкотам рэфэрэндуму. Ужо былі два рэфэрэндумы, пасьля якіх усё ламалася. Таму і цяпер, калі дапусьцім рэфэрэндум, ня будзе ні палаткі, ня будзе нічога. Гэта прафанацыя дзейнасьці, калі хтосьці займаецца ў сёньняшняй сытуацыі падрыхтоўкай да нейкіх выбараў. Гэта будзе канец кар’еры гэтых людзей як палітыкаў.

бе БНФ.

БСДП (НГ) мае сваю асобную пазыцыю і наконт праграмы, зь якой партыйная кааліцыя можа пайсьці на выбары. 28 ліпеня партыя Статкевіча выступіла з ініцыятывай стварэньня шырокай Эўрапейскай кааліцыі, якая «магла б выступіць адзінай альтэрнатыўнай сілай на будучых парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбарах». Партыя ніяк ня хоча зьмірыцца з пэрспэктывай апынуцца ў ценю «пяцёркі», што ўбіраецца ў сілу. Менавіта ў гэтым бачыць прычыну зьяўленьня «эўрапейскае» ініцыятывы Анатоль Лябедзька. «Гэта нейкая палітычная рэўнасьць. Ствараецца альтэрнатыва аб’яднаўчаму працэсу, які набывае моц. Тое, што яны прапануюць, ужо даўно зафіксавана ў праграме нашай і іншых партыяў», — пацiскае плячыма А.Лябедзька.

У прыватных размовах лідэры апазыцыі не хаваюць свайго меркаваньня, што «Статкевіч чамусьці цяпер робіць усё, каб аб’яднаньня апазыцыі не адбылося. Нават ягоныя былыя саюзьнікі камуністы і працавікі гэта ўжо зразумелі».

## Аб’яднаньні сапраўдныя і несапраўдныя

Блёк «Свабодная Беларусь» ад самага свайго стварэньня (4 чэрвеня сёлета) абвесьціў, што самастойна падрыхтуе і выставіць на парлямэнцкія выбары 110 (па колькасьці дэпутатаў палаты прадстаўнікоў) сваіх кандыдатаў. Праўда, пазьней адзін з кіраўнікоў блёку Андрэй Саньнікаў удакладніў, што дэмакратычным сілам варта дамовіцца наконт падзелу акругаў. Але тады, у пачатку чэрвеня, ён не заўважаў у палітычных партый імкненьня ісьці на перамовы з блёкам. Мала што зьмянілася і на сёньня.

«Мы падкрэсьліваем, што аб’яднаньне павінна адбывацца пасьля зробленага аналізу выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы, — кажа А.Саньнікаў. — Гэта мусіць быць супольны крок. Калі ісьці паасобку, нічога не атрымаецца. Але пакуль не назіраецца сапраўднага аб’яднаньня. Бо дзяліць акругі — гэта не аб’яднаньне. Мы хацелі б бачыць сапраўднае аб’яднаньне напярэдадні выбараў». А пакуль «Свабодная Беларусь», кажа Саньнікаў, вядзе толькі кансультацыі з апазыцыйнымі партыямі. Пра перамовы няма і гаворкі. Ня склаліся адносіны ў новага блёку і з «Рэспублікай». Прычына тут у «дзіўных паводзінах» дэпутатаў падчас веснавой акцыі «За лепшае жыцьцё!» ды пазьнейшая спроба «скрасьці» гэты брэнд, прыдуманы хартыстамі.

На што можа спадзявацца «Свабодная Беларусь»? На паўтарэньне гісторыі з «Зубром», які стварыўся напярэдадні мінулых прэзыдэнцкіх выбараў і імкліва ўварваўся ў палітычнае жыцьцё краіны. Сьпешны старт блёку — гэта спроба «Хартыі’97» ускочыць у апошні вагон цягніка і не застацца на збочыне. Фактычна «Свабодная Беларусь» будзе рабіць стаўку на структуры руху «Зубр», іншых яна ня мае. «Зубр» сёлета зноў актывізаваўся, але ён мае ўплыў толькі сярод моладзі.

«Я не разумею, што гэта за блёк «Свабодная Беларусь», калі ён не аб’ядноўвае ні партый, ні арганізацый, а толькі прыватных асобаў», — кажа Таццяна Працька, кіраўніца Беларускага Хельсынскага камітэту, якая блізка супрацоўнічае з групай «Рэспубліка».

## Выбудоўваецца парлямэнтарная сытуацыя

Няма нічога дзіўнага, што перад выбарчым стартам налічваецца некалькі палітычных цэнтраў. Інакш і быць ня можа ва ўмовах, калі дзейнасьць вядзецца ва ўмовах напаўпадпольля, пляцовак для каардына-



цыі сілаў няма і, галоўнае, апазыцыя не прадстаўленая ў парлямэнце. Апазыцыі бракуе мэханізмаў узгадненьня пазыцый, не стае таксама ўменьняў знаходзіць кампрамісы — усяго таго, што прыходзіць з працай у парлямэнце. Улады ж маюць шмат прыладаў для маніпуляваньня апазыцыйнай думкай і яшчэ ня ўсе зь іх задзейнічалі. Ці азначае гэта, што малацікавая для абываццеля тарганіна вакол стварэньня кааліцый і блёкаў, гэты нефотагенічны спод палітычнага працэсу, так і не прывядзе ўрэшце да зьяўленьня адзінае Дэмакратычнае Сілы? Пакуль 60:40 на карысьць таго, што аб’яднаньне нарэшце адбудзецца. А вопыт арганізацыі кулюарных працэдураў — неацэнны грунт для будучай, пасьлялукашэнкаўскай парлямэнтарнае сытуацыі.

**Алег Тачоны, Мікола Бугай**

# Чаму ранейшыя кааліцыі развальваліся

За часы знаходжаньня ля ўлады Аляксандра Лукашэнкі апазыцыйныя сілы неаднаразова намагаліся аб’яднаць свае высілкі ў барацьбе за ўладу.

**Летам 1996 г.** сем апазыцыйных партый зьбіраюцца на **«круглы стол»** для каардынацыі дзейнасьці. У кастрычніку 1996-га быў праведзены нацыянальны кангрэс «У абарону дэмакратыі, супраць дыктатуры». Аднак поўнага адзінства дзеяньняў не было з прычыны адсутнасьці адзінага цэнтру кіраваньня. На такую ролю прэтэндаваў Вярхоўны Савет, тады як найбольшую папулярнасьць сярод палітычна актыўных выбарцаў меў БНФ, у ВС не прадстаўлены. У выніку ўнутрыкааліцыйная дысцыпліна так і не ўсталявалася.

У **1999 г.** паўстае **Кансультацыйная рада апазыцыйных палітычных партыяў** (АГП, БНФ, БСДП(НГ), БСДГ, БПП, Партыя жанчын «Надзея», ПКБ). Кароткі час у склад Рады ўваходзілі ЛДП і «беларускі» «Яблык» Абрамавай. Структура паўстала з ініцыятывы АБСЭ і аб’яднала і жука і жабу і рака з кляшнёю. Будучыні ня мела.

**31 жніўня** было абвешчана пра **аб’яднаньне маладых палітыкаў «новай хвалі»** «для правядзеньня восеньскага наступу на дыктатуру». У групу ўвайшлі Зьміцер Бандарэнка, Алесь Бяляцкі, Вінцук Вячорка, Аляксандар Дабравольскі, Павал Данэйка, Віктар Івашкевіч, Анатоль Лябедзька, Мікола Статкевіч. Іх намаганьнямі 17 кастрычніка быў праведзены першы «Марш





Свабоды», а ў сакавіку 2000-га — другі. Ініцыятыва не прадугледжвала фармальнага аб’яднаньня і ўнутрыкааліцыйнага цэнтралізму.

**У студзені** стварылася **Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў** (КРДС), у якую ўвайшлі АГП, БНФ, БСДП (НГ), БСДГ, БПП, Партыя жанчын «Надзея», экалягічная партыя «БЭЗ», Асамблея няўрадавых арганізацыяў, «Хартыя’97» і Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў. Задачай КРДС было аб’яднаньне апазыцыі для ўдзелу ў будучых парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбарах. Аднак, кааліцыя ня мела прывабнае назвы і ўнутранае дысцыпліны. Таму ў 2001 г. КРДС нават не ўдалося вылучыць свайго кандыдата ў прэзыдэнты. А БСДП (НГ), ПКБ і БПП у **ліпені 2001-га** ўтварылі левацэнтрысцкую **канфэдэрацыю «За сацыяльныя перамены»** як процівагу КРДС, якую яны лічылі «правацэнтрысцкай».

Кандыдата ж вылучыла г.зв. **«пяцёрка»** кандыдатаў у прэзыдэнты, утвораная ў **траўні 2001-га**. Яна яднала пераважна «адзінокіх палітыкаў» і была



моцна залежная ад парадаў сваіх замежных спонсараў. Параза на выбарах вырашыла яе лёс.

# Моладзь у нас дысцыплінаваная

**Праз тры гады трэцюю частку выбарцаў складуць маладыя людзі, якім 18 гадоў споўнілася ўжо ў незалежнай Беларусі. Маладыя кандыдаты могуць стаць ня толькі патэнцыйнымі кандыдатамі ў дэпутаты парлямэнту на выбарах 2004 г., але і ўдзельнікамі прэзыдэнцкай гонкі 2006 г. «НН» зладзіла апытаньне сярод моладзевых лідэраў на тэму: «Якую стратэгію на выбары 2004 і 2006 г. прапануе моладзь?».**

**Барысавец Сяргей Салаш** не чакае ад моладзі нейкага «звышарыгі-



нальнага сцэнару». Ён мяркуе, што будуць прапанаваныя «абсалютна простыя, але ад гэтага ня менш эфэктыўныя мэтады»: пэрсанальны кантакт зь людзьмі, актыўнае ўцягваньне звычайных абываццеляў у выбарчы працэс.

На думку **Юрася Губарэвіча** зь Белаазерску, галоўнае для маладога лідэра — мець каманду, «здольную зрабіць бліскучую кампанію на парлямэнцкіх выбарах». На думку Губарэвіча, перад выбарамі можна чакаць аб’яднаньня маладых лідэраў «з мэтай ціску на партыйнае кіраўні-



цтва». Асноўная мэта — прымусіць партыйных кіраўнікоў заняць узгодненую пазыцыю адносна выбараў у парлямэнт і кандыдатуры адзінага прадстаўніка ад апазыцыі на прэзыдэнцкія выбары.

Каардынатар «Зубра» **Ўладзімер Кобец** катэгарычны: «Людзі хочуць бачыць апазыцыю аб’яднанай. Зна-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

чыць, яна мусіць аб’яднацца і перамагчы».

Гарадзенец **Сяргей Антусевіч** лічыць, што маладыя палітыкі маюць важную перавагу перад старэйшымі — многія яшчэ ня ведаюць горычы паразаў.

**Алесь Мазур** зь Сьветлагорску прагназуе, што на парлямэнцкай кампаніі, пры ўмове добрай працы з выбарцамі, цалкам рэальна правесьці да дваццаці дэмакратычных кандыдатаў.

Бабруйчанін **Алесь Чыгір** перакананы, што ў кожным рэгіёне краіны будзе свой сцэнар выбарчай кампаніі, з улікам мясцовых асаблівасьцяў. «У адрозьненьне ад мясцовых выбараў, на парлямэнцкіх 30-гадовым цяжка будзе перамагчы, — кажа Чыгір. — Выбарцы будуць падтрымліваць чалавека, які выклікае давер, падаецца рэспэктабэльным, моцным, упэўненым, за якім ёсьць нейкі рэсурс. Таму на парлямэнцкія выбары павінны ісьці людзі, якія ўжо сфармаваліся як палітыкі».



А вось намесьнік старшыні «Маладых сацыял-дэмакратаў» **Павал Гормаш** ня думае, што парлямэнцкія выбары будуць вельмі ўдалымі для апазыцыі: «У дзяржавы ёсьць вялікі арсэнал сродкаў дзеля таго, каб так сталася. Таму парлямэнцкія



выбары разглядаю як падрыхтоўку да выбараў прэзыдэнцкіх». Ён прапануе ўжо цяпер пачаць працэс адкліканьня тых дэпутатаў, якія не апраўдалі даверу выбарцаў. Гэта быў бы першы крок да замены іх на дэпутатаў дэмакратычных.

**Паліна Панасюк** зь Берасьця кажа, што пры захаваньні сёньняшняга млявага падыходу нацыянальных сілаў да сыстэматычных Лукашэнкавых удараў ніжэй пояса сцэнар якіх заўгодна «выбараў» можна распісаць на сто гадоў наперад. «Моладзі надакучыла быць масоўкай бязглуздых спэктакляў», — кажа Паліна.

З аптымізмам глядзіць у будучыню лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту» **Павал Севярынец**. На яго думку, «галоўная праблема ў сёньняшніх беларускіх выбарчых сцэнарах — сыстэма падкантрольных рэжыму камісіяў і фальсыфікацыяў, якая практычна гарантуе патрэбныя ўладзе вынікі». Лідэр «Маладога фронту» акрэсьліў пасьлядоўны сцэнар: першы крок — у 2004 г. трэба не дапусьціць выкарыстаньня ўладай «адміністратыўнага рэсурсу», датэрміновага галасаваньня, фальсыфікацыяў у часе падліку галасоў; другі крок — у 2005 г., згуртаваны ў акругах і на вуліцах,



падчас адстойваньня вынікаў, парлямэнцкіх выбараў нацыянальны рух раскручвае двух-трох пэрспэктыўных кандыдатаў на прэзыдэнцтва, а пасьля ініцыюе ды выйграе апазыцыйныя праймэрыз; трэці крок — да 2006 г. аб’яднанае супрацівам і адзіным беларускім лідэрам пратэставае галасаваньне выліваецца ў аксамітную рэвалюцыю й дэмакратычныя пераўтварэньні. «Ясна, што на любым этапе гэтага сцэнару ў падзеі будзе ўмешвацца Масква, але яна мусіць атрымліваць жорсткі адлуп ад усяе беларускае эліты», — лічыць Севярынец.

Маладыя палітыкі схіляюцца да ўдзелу ў парлямэнцкіх выбарах. Але моладзь ня мае намеру ісьці на выбары асобным сьпісам. Моладзь па-ранейшаму верыць у «старэйшых».

**Сяргей Ёрш**

# Палата №3: стратэгія ўладаў

Выбары ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу адбудуцца праз год. Гэтым разам кулюарныя перадвыбарчыя primeries стануцца вельмі гарачымі: ад дэпутатаў палаты №3 будзе ў многім залежаць, якая сытуацыя складзецца ў рэгіёнах перад прэзыдэнцкімі выбарамі-2006 і як яна будзе выкарыстаная.

Відавочна, што прэзыдэнт Лукашэнка будзе намагацца застацца на сваёй пасадзе і пасьля 2006 г. Аб гэтым за апошні год ён казаў неадназова і досыць празрыста. У сваім апошнім інтэрвію расейскаму каналу НТВ, праўда, ён жа сказаў, што ў бліжэйшы час палітычных баталіяў не прадбачыцца. Але па-першае, усе дзевяць прэзыдэнцкіх гадоў паказалі, што адсутнасьць «баталіяў» у прэзыдэнцкім разуменьні гэтага слова зусім не азначае адначасовую адсутнасьць палітычных кампаніяў, а па-другое, нават калі канстытуцыйны рэфэрэндум ня будзе праведзены ўвосень гэтага году, дык гэта ня значыць, што ён ня будзе праведзены ўвесну наступнага году ці нават адначасова з выбарамі ў палату прадстаўнікоў праз год.

Адзін з сцэнараў адпадае адразу — той, які прадугледжвае сумленную барацьбу, адкрытую кампанію з наяўнасьцю агітацыі. Спадзявацца на перамогу ў такой сытуацыі ўладам не выпадае. Таму засяродзім увагу на двух праўдападобных сцэнарах, якія ўлада больш-менш пасьпяхова ўжо выкарыстоўвала на выбарах.

### Сцэнары

Першы сцэнар спрацаваў падчас выбараў у палату №2 15 кастрычніка 2000 г. Каб сарваць байкот выбараў, аб'яўлены правымі дэмакратычнымі партыямі, улады выставілі ў шэрагу акругаў па некалькі сваіх кандыдатаў-канкурэнтаў. Тыя прадстаўнікі апазыцыі, якія вырашылі ўзяць удзел у выбарах, адсякаліся ўжо на першым туры (фальсыфікацыі ў ім, паводле ацэнак незалежных экспэртаў, не сягалі больш за 15—20%). На думку лідэра БСДП (НГ) Міколы Статкевіча, асноўныя фальсыфікацыі адбыліся на этапе папярэдняга галасаваньня. Бо на шмат якіх участках колькасьць тых, хто прагаласаваў датэрмінова, складала 50—60%.

Другі сцэнар быў ажыцьцёўлены на мясцовых выбарах 2 сакавіка гэтага году. Каля 30% прэтэндэнтаў на мандат дэпутата мясцовага савету папросту не былі зарэгістраваныя, а кандыдат ад улады вылучаўся ў кожнай акрузе толькі адзін (гаворка йдзе пра рэйтынгавыя саветы — Менскі гарадзкі ды абласныя). Гэты адзіны «сьпісавы» кандыдат ад улады й сьвяткаваў перамогу. Падаецца, што менавіта такі сцэнар кампаніі будзе «ўзяты на ўзбраеньне» і ў наступным годзе: калі на выбарах сустракаюцца два кандыдаты ад улады, ствараецца ня толькі ілюзія барацьбы ў шараговых выбарцаў, але й ілюзія ўласнае перамогі ў кандыдата-пераможцы. У такім выпадку наваяўлены дэпутат будзе дэманстраваць большую ступень самастойнасьці, чым той, якога праводзяць паводле «сьпісаў адзінапрызначаных». Зыходзячы з гэтага сцэнару, на найбліжэйшых выбарах нерэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты будзе вельмі масавай і можа дасягнуць 50%. Ва ўсялякім выпадку, палітолягі называюць такія лічбы. Зь імі пагаджаюцца й лідэры партыяў.

### Акалічнасьці

Сцэнараў можа быць рэалізавана шмат, нават пры захаваньні дзейнага выбарчага заканадаўства. А тое, што яно будзе зьмененае перад найбліжэйшымі парлямэнцкай і прэзыдэнцкай кампаніямі, вельмі сумнеўна. Хоць дэпутацкая група «Рэспубліка» і зьбіраецца да канца гэтага году сабраць паўмільёна подпісаў за ўнясеньне зьменаў у Выбарчы кодэкс.

Чаго дамагаецца «шырокая дэмакратычная грамадзкасьць»? Першае: ліквідацыі датэрміновага галасаваньня. Другое: уваходжаньня ў склад выбарчых камісіяў прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацый і палітычных партый. Трэцяе: пашырэньня паўнамоцтваў назіральнікаў. Чацьвертае: усе справы, датычныя парушэньняў выбарчага працэсу, мусяць разглядацца ў судовым парадку. Кожная з гэтых умоваў непрымальная для ўлады.

Захаваньню ранейшых, «напаўсярэднявечных» умоваў для «нячэсных» кандыдатаў спрыяюць і дзяржаўныя грашовыя выдаткі на агітацыю (за тыя грошы магчыма толькі надрукаваць уласны партрэт адпаведнай якасьці й пужаць ім выбаршчыкаў), і ўмовы выкарыстаньня СМІ падчас кампаніі: кожны кандыдат атрымлівае па дзесяць бясплатных хвілінаў на ТВ у запісе і невядома, у які дзень той запіс будзе прадэманстраваны.

### Кандыдаты

Адзінае, што сёньня вядома, — гэта пералік тых, хто будзе складаць «сьпіс улады». Гэта, па-першае, спэцслужбы, па-другое, аблвыканкамы (на ўзроўні старшыняў) і Менгарвыканкам, а патрэцяе, новаўтвораная прэзыдэнцкая «група сямі» ў асобах сьпікера Вадзіма Папова, дэпутатаў Віктара Гумінскага, Сяргея Забалотца, Аляксандра Сьвырыда і Шпілеўскага, Уладзімера Дзервянкова і Міхаіла Арды. Кожны зь іх адказвае за свой «куст» (сілавікі, моладзь, гаспадарнікі і г.д.). Кожны павінен, як у сеткавым маркетынгу, прывесьці за сабой па некалькі аднадумцаў, і ўжо гэты «новы савет палаты» будзе разам зь іншымі прапанаваць кадры ў сьпіс правераных і дапушчаных. З каго ён будзе фармавацца, пакуль невядома. Разнарадка на прадпрыемствы, установы і арганізацыі, згодна з нашымі зьвесткамі, яшчэ не паступала. Але ня трэба забывацца, што ў сьпіс трапяць як мінімум 50% зь сёньняшняга складу палаты. То бок набраць давядзецца толькі блізу 50 «новых» людзей. Але і гэта ўяўляецца досыць складанай задачай, бо чалавечы рэсурс — гэта тое, з чым ва ўлады заўсёды былі вялікія праблемы, а цяпер — тым больш. Гэты рэсурс амаль вычарпаны, бо чэрпаюць увесь час з адных і тых самых крыніцаў. І ў гэтым ёсьць шанец для апазыцыйных і незалежных патэнцыйных кандыдатаў.

**Зьміцер Дрыгайла**

МЕРКАВАНЬНЕ ПАЛІТОЛЯГА

# Перамагчы ў галовах

Што можна назваць крытэрам посьпеху дэмакратычных сілаў на парлямэнцкіх выбарах? Не заваяваньні большасьці галасоў. Законы ў нашай краіне перапісваюцца дэкрэтамі, таму аб выкарыстаньні парлямэнту як цэнтру ўлады гаварыць няма нагоды. Калі ўлада і захоча «пагуляць у дэмакратыю», яна зробіць гэта толькі пасьля таго, як усё, што можа скласьці ёй апазыцыю, будзе зьнішчана. Добра, калі некалькі апазыцыянэраў прарвуцца ў палату прадстаўнікоў дзеля выкарыстаньня сваіх мандатаў у інфармацыйных ды агітацыйных мэтах. Але ня менш важным зьяўляецца сам працэс выбараў.

Парлямэнцкія выбары пры любым раскладзе мусяць стаць рэпэтыцыяй прэзыдэнцкіх выбараў. Галоўныя задачы — папулярызацыя брэнду «дэмакратычная апазыцыя»; падрыхтоўка арганізацыйнай схемы працы; адпрацоўка варыянтаў супрацьдзеяньня фальсыфікацыям.

Як паказвае досьвед прэзыдэнцкіх і мясцовых выбараў, каманды-аднадзёнкі няздольныя да эфэктыўнай дзейнасьці і рассыпаюцца, ледзьве пачынаюцца праблемы зь фінансаваньнем. Таму фармат удзелу дэмсілаў у выбарах хутчэй за ўсё будзе партыйным. Дый зарэгістраваць непартыйнага апазыцыйнага кандыдата робіцца ўсё цяжэй. Але такі фармат не азначае, што мэты кампаніі-2004 павінны фармулявацца як партыйныя. Палітычныя лідэры мусяць зрабіць адказны выбар, што для іх важней: праца на дэмакратызацыю краіны ці наіўнае імкненьне стацца «першым хлопцам на сяле».

**Каб выйграць, дэмсілам трэба аб'яднацца задоўга да пачатку передвыбарчай кампаніі**. Гутарка ідзе не пра мітычныя «шырокія грамадзянскія кааліцыі», а пра хаўрус рэальна дзейных палітычных структураў. Ня варта рабіць трагедыі з таго, што некаторыя сілы ідуць на выбары паасобку. Такія «адзіночкі» ня маюць значнай палітычнай сілы, іх можна праігнараваць. Бо нэгатыўная агітацыя адной апазыцыйнай сілы супраць іншай будзе шкодзіць абедзьвюм.

Кампанія дэмсілаў павінна мець **агульнанацыянальны характар.** Выбары ладзяцца паводле мажарытарнай сыстэмы. Гэта падзяляе агульнанацыянальную кампанію на сотню мясцовых. Такі расклад ператварае выбары ў мясцовы конкурс прыгажосьці, на якім палітычныя пытаньні не акцэнтуюцца. Таму кампанія дэмакратаў ва ўсіх акругах павінна мець супольную тэму, супольныя акцэнты і супольную ідэю — тое, з чаго выбаршчыкі хутка ідэнтыфікуюць дэмакратычныя сілы на прэзыдэнцкіх выбарах.

Кампанія павінна мець **інтэнсіўны характар** з прыцэлам на будучыню. Апрацоўка грамадзянскай апініі пачынаецца з моманту вылучэньня кандыдатаў. Тут ключавую ролю мусіць адыграць збор подпісаў. Яны — адна зь нешматлікіх магчымасьцяў супрацьдзеяньня фальсыфікацыям: іх колькасьць павінна перавышаць колькасьць галасоў, якую ўлады «аддадуць» альтэрнатыўным кандыдатам. Подпісы могуць стацца «базай зьвестак» падчас прэзыдэнцкіх выбараў, дзе на этапе вылучэньня трэ будзе сабраць паўтара мільёна подпісаў за адзінага кандыдата.

Магчымыя **фальсыфікацыі — ня повад, каб складаць рукі** або бегчы па дапамогу да міжнароднай супольнасьці. Калі ў дэмакратычных сілаў зьяўляюцца доказы, яны павінны быць скарыстаны дзеля апрацоўкі грамадзкай думкі і аказаньня псыхалягічнага ціску на сяброў камісіяў перад прэзыдэнцкімі выбарамі.

**Калі парлямэнцкія выбары будуць сумешчаныя з рэфэрэндумам,** дэмакратычныя сілы павінны будуць выбраць, якой кампаніяй яны мусяць заняцца найперш. На мой погляд, гэта павінен быць менавіта рэфэрэндум. Трэба не паўтарыць памылкі 1996 г., калі перад рэфэрэндумам частка апазыцыйнага рэсурсу была адцягнутая на бессэнсоўныя выбары ў Вярхоўны Савет, які сканаў адразу пасьля галасаваньня. У такім выпадку парлямэнцкія выбары ператвораца ў контрагітацыйную кампанію супраць плянаў прэзыдэнта.

Пра посьпех выбараў можна будзе казаць, калі апазыцыя здолее «перамагчы ў галовах», незалежна ад таго, што пададуць у пратаколах выбарчыя камісіі. Калі змогуць пераламіць стэрэатыпы аб апазыцыі ў выбаршчыкаў. Калі вылучаць новых прывабных лідэраў і здолеюць адрадзіць апазыцыю ня толькі інфармацыйна, але і арганізацыйна. У цяперашніх палітычных умовах усё гэта больш важна, чым тое, пяць ці сем мандатаў выйграе нейкая партыя ці ўсе дэмакраты разам.

**Віталь Сіліцкі**

ТРЫБУНА ПАЛІТЫКА

# Чатыры ўмовы для апазыцыі

Прызнаюся адразу: кампанія выбараў у ППНС 2004 г. мне моцна не падабаецца. З 2000-га, ад часоў вядомага «байкоту», прынцыпова не зьмянілася нічога, апроч, хіба, пазыцыі апазыцыі. Больш таго, мясцовыя «выбары», асабліва ў Менску й акругах абласных саветаў, яскрава засьведчылі: рэжым зьбіраецца поўнасьцю кантраляваць абраньне *кожнага* з 110 дэпутатаў. Нарэшце, небясьпека міжнароднага прызнаньня «палаткі» зь легітымізацыяй усяе ўладнае сыстэмы сёньня толькі абвастрылася.

І ўсё-такі — ісьці на выбары. Чаму? Існуе самаменш чатыры прычыны, паводле якіх апазыцыйныя партыі ісьці на выбары 2004 г. мусяць. І якраз гэтыя прычыны зьяўляюцца сыстэматворнымі для распрацоўкі пасьпяховае стратэгіі. Гэта як чатыры ўмовы АБСЭ для рэжыму. Правілы гульні. Толькі для апазыцыі.

1. НЯМА ВЫБАРУ. Калямбур, канечне, але іншага выбару, чым ісьці на выбары бяз выбару, у дэмакратычных сілаў не засталося. З вуліцы сышлі, з намэнклятурай ня зновіліся, між сабою перасварыліся — а што яшчэ застаецца?.. Як ні парадаксальна, адсутнасьць выбару ў такой сытуацыі матывуе: чалавек, загнаны ў кут, здольны біцца насьмерць (праўда, трэба яшчэ ўсьвядоміць безвыходнасьць свайго становішча).

2. СПАЧАТКУ — СЛОВА. Падчас выбараў актывісты апазыцыі ня будуць мець аніякіх правоў і гарантыяў, апроч права размаўляць зь людзьмі і гарантыі разнастайных непрыемнасьцяў за такія размовы. Гэта будзе ток-шоў «Выбары»: вас нікуды не абяруць, нават калі вы выйграеце. Але вы вырашаеце галоўную, дагэтуль непадымную задачу: *гаворыце зь Беларусяй*. Бо без асабістае размовы з гэтым народам нельга дамагчыся нічога. Калі апазыцыі ўдасца растлумачыць сямі мільёнам выбаршчыкаў, што яна думае, — гэта будзе несумненны пералом.

3. НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ. Лукашэнка, узяўшы на ўзбраеньне дзяржаўніцкую рыторыку, неспадзявана даў фору нацыянальнаму руху. У тэме незалежнасьці мы *мацнейшыя за яго*. Парлямэнцкі фармат — найлепшая пляцоўка для *беларускага* наступу (гл. выбары 1990 г.). І замест дзіўнае кааліцыі БНФ, АГП ды камуністаў куды больш лягічным выглядала б задзіночаньне ў блёк усіх нацыянальных сілаў дзеля магутнае незалежніцкае агітацыйнае кампаніі. Недапушчальна падтрымліваць у акругах тых, хто за саюз з Расеяй або супраць бел-чырвона-белага сьцягу. Яднаючы дэмакратаў і электарат Лукашэнкі на тэме незалежнасьці, мы стратэгічна перайграем і дыктатуру, і імпэрыю.

4. АСАБІСТАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА. Нарэшце, кожны кандыдат на выбарах 2004 г. — гэта ўжо сур'ёзны выклік пэрсанальна Лукашэнку. Пытаньне асабліва актуальнае ў сьвятле падзеньня рэйтынгу апошняга й росту пратэстных настрояў. З сотні лепшых удзельнікаў кампаніі насамрэч будзе лягчэй выбраць кандыдата ў прэзыдэнты, чым з кулюарных «двоек», «троек» ды «пяцёрак». Тут гульня ў адкрытую, дзе ясна відаць перавагі й недахопы кожнага. Гартуючы сто дзесяць палітыкаў нацыянальнага роўню, мы падымаем цэлы пласт новых лідэраў, патэнцыйна здольных асабіста супрацьстаяць Аляксандру Рыгоравічу ў 2006 г.

Зрэшты, у гэтых раскладах ёсьць і велічыня невядомая. Рэфэрэндум або яго заменьнік, які можа ператварыць выбары 2004 г. у зусім іншую гульню.

**Павал Севярынец**

# Ва ўмовах сакрэтнасьці

## Урад марыць пра сваю нафту, недарагі газ ды самую танную ў сьвеце электрычнасьць, але чамусьці вядзе пра гэта сакрэтныя перамовы

**«Мы можам і без прыватызацыі абысьціся», — горда заявіў А.Лукашэнка, маючы на ўвазе продаж беларускай нафтахіміі. Праўда, катэгарычна прыватызацыі кіраўнік Беларусі ня выключыў, але абыдзецца яна расейскаму бізнэсу нятанна: «Калі ў вас грошай шмат, вы можаце 90% набыць». Выступ нагадваў «артпадрыхтоўку» напярэдадні перамоваў з «Газпромам», якія адбыліся 25 ліпеня. Вынік — падпісаньне дамовы пра рознагалосьсі. Урад, як і раней, ацэньвае «Белтрансгаз» у 5 млрд даляраў і жадае пакінуць сабе кантрольны пакет акцыяў. «Газпром» у адказ наадрэз адмовіўся павялічваць налета пастаўкі газу па ўнутрырасейскіх цэнах.**



IREX-PROMEDIA

Урад заламіў высокія цэны за нафтахімічныя прадпрыемствы. Каб паказаць, што можна абысьціся і без багатага дзядзькі, была прынятая новая праграма мадэрнізацыі «Нафтану» на 2004—2008 г. Яна ўвогуле не прадугледжвае буйнога інвэстара — адмысловыя падлічылі, што прадпрыемству дастаткова будзе ўкласьці ў яе 224 млн даляраў замест 600 млн.

Пасьля мадэрнізацыі нафтаперапрацоўчых заводаў глыбіня перапрацоўкі нафты складзе 78—79%. Гэта амаль заходні стандарт, значна вышэйшы за сярэднерасейскія 66—67%. Пладоў мадэрнізацыі ўжо можна пакаштаваць. «Белнафтахім» гэтак актыўна прадае сваю прадукцыю, што скараціў запасы на сховішчах да 29,3% ад сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасьці, у той час як нарматыў складае 50%. Віцэ-прэзыдэнт канцэрну Анатоль Філонаў заявіў, што спадзявацца на пастаўкі расейскіх прадпрыемстваў нафтахіміі няма падставаў — варта разьвіваць уласную сыравінную базу. Паколькі запасы нафты невялікія, у якасьці «базы» дзяржава ўзяла ў свае рукі 2/3 імпарту нафты.

### Быка на індыка

Аднак справа ня толькі ў тым, каб як мага даражэй прадаць ці ўвогуле не аддаваць айчынную нафтахімію. Наракаючы на Расею за тое, што яна не жадае наладзіць з Беларусьсю супрацоўніцтва «ў пляне здабычы нафты, прычым за нашыя грошы, можа быць, за нашую ўласнасьць», А. Лукашэнка раскрыў свой глыбінны намер атрымаць радовішча ў абмен на акцыі нафтаперапрацоўчых заводаў.

Асаблівая цікавасьць у гэтым пляне выяўляецца да кампаніі «Сургутнефцегаз». Запасы нафты, якімі яна валодае, складаюць 2,5 млрд т. Паводле бізнэс-пляну, сёлета кампанія мае намер здабыць 52,9 млн т нафты. Летась адкрылі 11 новых нафтавых радовішчаў і адно новае радовішча газу, яшчэ шэсьць радовішчаў увялі ў дзеяньне. Чаму б не падзяліцца? Тым больш што раней «Сургутнефцегаз» правёў перамовы з амэрыканскай кампаніяй «Marathon Oil» наконт сумеснай распрацоўкі нафтагазавых радовішчаў у Заходняй Сібіры. Паралельна амэрыканская кампанія набыла «Ханты-Мансійскую нафтавую карпарацыю», якая валодае запасамі, роўнымі 40 млн т. Гэтага хапіла б, каб на некалькі гадоў цалкам забясьпечыць беларускія патрэбы ў нафце.

### Газавыя інтрыгі

На чым адмена бартэру дакладна не адаб'ецца, дык гэта на імпарце газу. Штогод Беларусь набывае газу на 600 млн даляраў. Але ў адрозьненьне ад былых часоў, мы жывём не ў пазыку, а плацім гатоўкай. Сёлета цалкам расплаціліся з «Газпромам», пры гэтым на 95% грашыма. Праўда, аддаём мы толькі 29 даляраў за тысячу кубамэтраў.

Аднак штыль на газавым рынку можа зьмяніцца бурай. Ад 1 жніўня ў Беларусь пачынае пастаўляць газ цюменская нафтавая кампанія «ТНК». Яна абяцае даць сёлета 250 млн м³ па 37 даляраў за тысячу кубоў. Налета «ТНК» зможа паставіць ужо 4 млрд, «Ітэра» — 6,3 млрд (па 42 даляры), «Газпром» — 10,2 млрд. Няцяжка падлічыць, што разам «негазпромаўскія» кампаніі будуць мець большую вагу. Аднак ад гэтага Беларусі лягчэй ня стане. Непрыемны падарунак — унутрырасейскае падвышэньне на 20% цэнаў на транспартаваньне газу для незалежных пастаўшчыкоў. Газ падаражэе, што балюча ўдарыць па спрэс газіфікаванай Беларусі (доля газу ў балянсе энэргарэсурсаў канцэрну «Белэнэрга» складае 92—93%). Рост цэнаў на газ адаб'ецца і на кватэрных рахунках. Налета мы і так мусім плаціць ужо 60% ад сабекошту ўтрыманьня жыльля — на 40% больш, чым цяпер. Ужо сёлета ў кастрычніку давядзецца плаціць 50 даляраў за трохпакаёўку, у якой жыве сям'я з 4-х чалавек.

У «Газпрому» зьнікла жаданьне патрабаваць частку акцыяў «Белтрансгазу» за «газавыя» запазычаньні. Кіраўніцтва расейскага канцэрну лічыць, што беларускі бок разьдзьмуў памеры «Белтрансгазу» за кошт недарэчных аб'ектаў, каб накруціць цану. Таму «Газпром» жадае атрымаць 140 млн даляраў запазычаньняў гатоўкай. Погляды канцэрну ды беларускага кіраўніцтва на рынкавую цану «Белтрансгазу» розьняцца прыкладна на 4 млрд даляраў — лічба, якая не дае шанцу на лёгкую згоду. Аптымізму дадае хіба толькі прэзыдэнцкае абяцаньне набываць «самую танную энэргію ў сьвеце». Дзе яе ўзяць, аднак, ён не ўдакладніў.

**Алесь Кудрыцкі**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### Зьніжаюцца стаўкі па крэдытах

**Нацбанк рэкамэндаваў кіраўніцтву банкаў зьменшыць працэнтныя стаўкі па крэдытах фізычным і юрыдычным асобам.** Пры атрыманьні крэдыту ў СКВ на тэрмін больш за год у жніўні-верасьні стаўкі мусяць складаць да 10,5% гадавых, у кастрычніку-лістападзе — 10% і ў сьнежні — 9,5%. Стаўкі па крэдытах на тэрмін да году маюць быць адпаведна да 12%, 11,5% і 11% гадавых. Па крэдытах у рублях перавышэньне базавай стаўкі рэфінансаваньня павінна складаць у жніўні 5%, у верасьні—кастрычніку — 4% і ў лістападзе—сьнежні — 3%.

### Кувэйт зьменшыў крэдыт

**Кувэйцкі фонд арабскага эканамічнага разьвіцьця (КФАЭР) выдаткуе 30 млн даляраў крэдыту на рэканструкцыю першай чаргі Менскай ЦЭЦ-3.** У выніку рэканструкцыі магутнасьць ЦЭЦ павялічыцца на 20%. Крэдыт даецца на 20 гадоў зь пяцігадовай адтэрміноўкай пад 3,5% гадавых. Міністэрства энэргетыкі разьлічвала на 70 млн даляраў інвэстыцыяў. КФАЭР зьменшыў суму з-за стаўленьня Беларусі да вайны ў Іраку. Кошт усяе рэканструкцыі —140 млн даляраў.

### Пэнсіі падвысяць

**Дзеля кампэнсацыі інфляцыі ў жніўні прыкладна на 17% падвысяць усе віды пэнсіяў.** Мінімальныя пэнсіі пабольшаюць толькі на 13,9%. Павялічацца таксама памеры сацыяльнае дапамогі, прэміяў і авансаў.

### Юбілей беларускай валюты

**26 чэрвеня адзначыў дзесяцігадовы юбілей беларускі «зайчык»: 10 год таму з звароту былі выведзеныя савецкія грошы.** Праўда, праз два гады «зайчык» патрапіў нават не ў чырвоную, а чорную кнігу: здрабнеў занадта ды зрабіўся ахвярай банкнотаў буйнейшага наміналу. У 1995 г. зьвяры ўвогуле зьвяліся, пакінуўшы пасьля сябе архітэктурную пустэльню.

### БелАЗ паднавілі

**БелАЗ скончыў мадэрнізацыю вытворчасьці, распачатую яшчэ ў 1999 г.** На 201 адзінку новага, у асноўным замежнага абсталяваньня БелАЗ патраціў каля 227 млн даляраў. Асноўныя грошы бралі ў крэдыт у Чэскага экспартнага банку.

### Падаткавікі праверылі кожнага пятага

**За паўгоду падатковыя інспэктары праверылі 18% юрыдычных асобаў ды прыватных прадпрымальнікаў.** Найбольш правяралі сталіцу ды Гарадзенскую і Менскую вобласьці. Як выявілася, падатковае заканадаўства парушаюць 75% юрыдычных асобаў ды 45% «прыватнікаў». Агульная сума штрафаў ды спагнаных у выніку праверак падаткаў пацягнула на 35 млрд рублёў.

**АК, БелаПАН, АФН**

ЯК У ІНШЫХ

# Палякі пакідаюць найсмачнейшыя кавалачкі сваім

**Самымі балючымі кропкамі польскае прыватызацыі заўсёды былі мэталюргія ды нафтахімія. Калі першую ніяк не маглі збыць, дык другую аддаваць было шкада. Аднак цяпер абодва пытаньні здымаюцца: мэталюргія ды нафтаперапрацоўка будуць прыватызаваныя. Вырабам сталі займуцца замежнікі, бэнзыну ды саляркі — палякі.**

Выраб сталі — цяжар для польскага бюджэту. Каб прадухіліць катастрофу ў гэтай галіне, дзяржава трымала высокія мыты на імпарт сталі, давала заводам падатковыя льготы, не зважала на нясплачаныя банкаўскія пазыкі, дзеля чаго эканоміка губляла сотні мільёнаў даляраў у год. Усё гэта выклікала нараканьні з боку кіраўніцтва Эўразьвязу.

Ня здолеўшы рэструктурызаваць выраб сталі, дзяржава вырашыла перадаць яго ў прыватныя рукі. Падрыхтоўка да прыватызацыі пачалася летась у траўні. Чатыры найбуйнейшыя мэталюргічныя заводы, што выраблялі 70% сталі, былі зьлітыя ў адну структуру — Polskie Huty Stali (PHS). Урад дарма баяўся, што на тэндэр ня прыйдзе заявак: зьявілісія ажно два патэнцыйныя пакупнікі — брытанска-індыйскі LNM, другі па велічыні мэталюргічны холдынг у сьвеце, і крыху драбнейшы амэрыканскі вытворца US Steel.

Грашовы інтэрас пераважыў палітычны: урад распачаў перамовы не з амэрыканцамі, а з брытанска-індыйскім холдынгам. Аднак, калі да 22 жніўня польскі ўрад ды кіраўніцтва LNM не дамовяцца канчаткова, у гульню зноў уступіць US Steel.

Дзяржава патрабуе ад пакупніка вярнуць пазыкі PHS (400 млн даляраў), павялічыць капітал «гутаў» на 100—150 млн даляраў і набыць акцыяў на 225 млн даляраў. Продаж выклікаў масавыя звальненьні, што ня дужа радуе палякаў, зважаючы на ўзровень беспрацоўя ў краіне, роўны 17,9%. Аднак прафсаюзы маўчаць: рабочым, якія застануцца працаваць, паабяцалі шчодрыя сацыяльныя выгоды, а звольненым, якіх будзе каля 16 тыс., — кампэнсацыі.

Польскі гешэфт зробіць LNM абсалютным лідэрам у Цэнтральнай Эўропе, бо холдынгу ўжо фактычна належыць уся мэталюргія Чэхіі ды Румыніі. Дарэчы, прыватызацыя румынскай мэталюргіі не абышлася без скандалу. Летась Тоні Блэр актыўна падтрымаў выхад LNM на румынскі рынак. Як выявілася, незадоўга да гэтага кіраўнік брытанска-індыйскага холдынгу пералічыў буйную суму на рахунак Лейбарысцкай партыі.

Калі з мэталюргіяй абышліся паводле прынцыпу «баба з возу — колам лягчэй», дык нафтахімію чакае іншы шлях. Польская нафтаперапрацоўчая галіна павінна зрабіцца цэнтральнаэўрапейскім лідэрам, застаючыся ў руках айчыннага капіталу.

Гданьскі нафтаперапрацоўчы завод спрабавалі прадаць на працягу двух гадоў. Спачатку плянавалася, што 75% акцыяў пяройдуць да кансорцыюму, які складаецца з вопалату польскай нафтахіміі PKN Orlen ды брытанскай кампаніі Rotch Energy. Але цяпер тэндэр на набыцьцё Гданьскага нафтаперапрацоўчага заводу перапынены. Ён будзе зьліты зь меншымі нафтаперапрацоўчымі заводамі на поўдні краіны — у Ясьле, Горліцы ды Чэхавіцы. Ня выключана, што да гэтай так званай «Групы Лётас» далучыцца фірма Petrobaltic, якая дасьледуе нафтавыя ды газавыя запасы ў Балтыцы. Прэзыдэнт «Групы Лётас» Павал Аляхновіч ужо заявіў, што кампанія ня будзе прымаць замежныя інвэстыцыі.

Потым будзе зроблены наступны крок: «Лётас» ды PKN Orlen, які займае 64% польскага паліўнага рынку, сфармуюць вялізны цэнтральнаэўрапейскі кансорцыюм. Да яго змогуць далучыцца такія гіганты нафтахіміі, як вугорскі MOL ды аўстрыйскі OMV. Адна з мэтаў — набыць большую вагу на перамовах з расейскімі ды арабскімі пастаўшчыкамі нафты.

Мала таго — «Лётас» атрымаў субкантракт ад фірмы Kellog, Root & Brown, якая ў сваю чаргу належыць амэрыканскаму паліўнаму гіганту Halliburton. Цяпер «Лётас» будзе дапамагаць амэрыканцам рэканструяваць іракскую інфраструктуру нафтаздабычы. Польскія фірмы атрымаюць просты доступ да нафтавых сьвідравінаў Іраку, што закладзе трывалы падмурак энэргетычнай незалежнасьці краіны.

**АК**

# Біскуп Прагі ў Рэдакцыі «НН»



АРЦЁМ ЛЯВА

**Ня мінулым тыдні ў Беларусі пабываў каталіцкі біскуп Прагі Вацлаў Малы. Ён, паплечнік Вацлава Гавэла ў дысыдэнцкім руху, адзін з маральных аўтарытэтаў сваёй краіны, прыехаў у Беларусь, паводле ягоных словаў, «як чалавек добрай волі, каб вас падтрымаць, бо чуў, што ў вас тут кепска». Здарылася гэта якраз у той час, калі ў сэнаце Чэхіі быў створаны клюб «За свабодную Беларусь», у які ўвайшоў і старшыня Сэнату Пэтэр Пітгард. Ганаровым кіраўніком клюбу пагадзіўся стаць Вацлаў Гавэл. Акрамя сустрэчаў з прадстаўнікамі Касьцёлу і праваабарончых арганізацый біскуп Малы наведаў і рэдакцыю «НН».**

Вацлаў Малы — рыма-каталіцкі біскуп, дэкан катэдральнага сабору Сьв.Віта ў Празе. У 1970—80-я браў актыўны ўдзел у дысыдэнцкім руху, быў падпісантам «Хартыі’77». Пасьля перамогі «аксамітнай рэвалюцыі» прысьвяціў сябе душпастырскай дзейнасьці. Летась ён наведваў Чачэнію, якая пакінула ў яго самыя страшныя ўражаньні за ўсё жыцьцё, а разбураны Грозны Вацлаў Малы параўноўвае з Апакаліпсысам. Біскуп зьяўляецца адным зь сямёх захавальнікаў ключоў ад Кароннага пакою сабору Сьв.Віта, дзе знаходзяцца кляйноды чэскіх каралёў (сярод іншых захавальнікаў — прэзыдэнт, прэм’ер, мэр Прагі, арцыбіскуп ды інш.). Традыцыйная цырымонія адкрыцьця пакою сымбалізуе еднасьць духоўных і сьвецкіх уладаў Чэхіі.

**«НН»: Калі параўноўваць нашу краіну з Чэхіяй, з разьвіцьцём яе дэмакратычнага руху, на якім этапе мы цяпер знаходзімся?**

**Вацлаў Малы:** Калі я ехаў у Менск, чакаў, што ўсё будзе выглядаць нашмат горш. Так, культура тут трохі іншая, чым у нас. Нават па архітэктуры можна сказаць, што вы тут жылі ў іншай абстаноўцы, чым мы падчас камунізму. Мне падаецца, што людзі ў вас сумныя, некамунікабэльныя, не ўсьміхаюцца. Я адчуваю тут нейкую тугу, прыгнечанасьць. Што мяне зьдзівіла, дык гэта адсутнасьць турыстаў. Тут ёсьць нейкае пачуцьцё ізаляцыі ад іншага сьвету.

Але што да абстаноўкі ў Беларусі, дык яе можна параўнаць з сытуацыяй у Чэхаславакіі ў сярэдзіне ці пры канцы 80-х. Хоць сыстэма ў вас нашмат больш складаная, чым сыстэма канца 80-х у нас. У нас рэпрэсіі былі адкрытыя, да апошняга моманту не было незалежнай культуры, ніводнай незалежнай газэты. Для гледача звонку нашмат цяжэй зразумець сытуацыю. Бо, калі чалавек захоча, ён можа тут знайсьці незалежныя газэты. Розныя цэнтры па правах чалавека маюць свае офісы. У 80-х у нас нічога падобнага не было. Напрыклад, «Хартыя’77» ніколі ня мела офісу. Рэпрэсіі з боку ўлады ў Беларусі нашмат больш складаныя і нават разумнейшыя, чым былі ў нас. Я б нават не сказаў, што гэта таталітарная сыстэма. Гэта нейкая дзіўная дыктатура, у якой шмат дзірак.

**«НН»: Як Вы ацэньваеце пэрспэктывы Беларусі ў справе ўваходжаньня ў Эўразьвяз?**

**В.М.:** Я не прарок, але скажу, што далучэньне Беларусі да Эўразьвязу — гэта яшчэ даўгі шлях. Бо ў Эўразьвязу цяпер шмат клопату з тымі краінамі, якія нядаўна ў яго ўвайшлі. А яшчэ ёсьць Баўгарыя і Румынія, эканамічныя паказьнікі якіх вельмі кепскія. Мне падаецца, што Расея ўжо пагадзілася з стратай Прыбалтыкі. Можа, яна пагодзіцца «згубіць» і Беларусь?.. Сёньня існуе праблема не ўступленьня ў Эўразьвяз, а таго, каб Эўропа ўспрымала Беларусь як незалежную, сувэрэнную краіну.

**«НН»: У першай палове 90-х была папулярная ідэя аб’яднаньня краінаў Цэнтральнай Эўропы. Але пасьля яна загасла. На Вашу думку, чаму яна аказалася нежыцьцяздольнай?**

**В.М.:** Я думаю, гэта была добрая, правільная ідэя. Я думаю, што нават пасьля ўступленьня ў Эўразьвяз гэтая ідэя, сярэднеэўрапейская, не зьнікае. Заходняя Эўропа будзе нас успрымаць як адзін блёк, бо яны прагматыкі. Для іх самая цікавая Польшча. А ў нас больш магчымасьцей абараняць свае інтарэсы не як адна краіна, а як аб’яднаньне некалькіх. Па-другое, у нас ёсьць досьвед жыцьця пад таталітарным рэжымам. У маладых людзей гэтага няма, але ў старэйшых пакаленьняў ёсьць. Я часта езьдзіў на Захад і ведаю, як цяжка там растлумачыць людзям, які ў нас досьвед. Мы добра апранутыя, у нас усё добра ў эканамічных парамэтрах. І на Захадзе пытаюцца: чаго ж вам бракуе? Ім ніколі не зразумець мэнталітэту, у якім мы 40 гадоў жылі. Таксама і праз гэта супраца Сярэдняй Эўропы вельмі важная. Па-трэцяе, народы Сярэдняй Эўропы могуць лепш зразумець праблемы й сьветапогляд краінаў былога СССР, чым французы ці ангельцы. У нас ня толькі блізкія мовы, але й супольны досьвед барацьбы з таталітарным рэжымам. Нельга, каб сытуацыя зьвялася да восі Бэрлін—Масква альбо Парыж—Масква. Пра нас у такой восі заўсёды будуць забываць. Гэта яшчэ адна прычына, чаму я думаю, што трэба падтрымліваць ідэю Сярэдняй Эўропы. Гэта не шавінізм, не мэсіянства, але прагматызм.

**«НН»: Краіны цэнтру Эўропы нарэшце зьяднала падтрымка Амэрыкі ў яе вайне ў Іраку.**

**В.М.:** З гэтым якраз-такі я не пагаджаюся. Мяне не пераканалі прычыны агрэсіі. Вядома, Хусэйн быў жорсткім дыктатарам, але ў мяне ёсьць падозраньні, што ў вайны былі эканамічныя прычыны, якія датычылі нафты. І што там пытаньне сфэры ўплыву. Пытаньне, напрыклад, — чаму ЗША ня цісьнуць на Саудаўскую Арабію, дзе таксама парушаюцца правы чалавека? Чаму яны дапускаюць, што Лібан застаецца калёніяй Сірыі? Чаму яны дапускаюць забойствы ў Эфіопіі, Конга, Судане? Я не хачу, каб ЗША былі сусьветным паліцыянтам. Я ня супраць Амэрыкі, але ў Іраку не была знойдзена зброя масавага зьнішчэньня. Пытаньне — чаму ЗША ня цісьнуць больш на Пакістан, дзе ёсьць фундамэнталізм, ядзерная зброя? Палітыка ЗША на Блізкім Усходзе мяне ня вельмі пераконвае.

**«НН»: Якую ролю адыгрывае Касьцёл у сёньняшняй Чэхіі?**

**В.М.:** Сытуацыя ня простая. Паміж грамадзтвам і Касьцёлам існуе пэўны недавер, шмат забабонаў, страх. У Чэхіі да гэтага часу не ўдалося ўкласьці дамову паміж дзяржавай і Касьцёлам. Бо ўсе ўрады адкладалі вырашэньне гэтай справы на будучае. Яны добра ведаюць, што грамадзтва ня будзе цісьнуць на ўрад у гэтай справе.

У той жа час застаецца ў нас такая традыцыя: ад дзьвярэй пакою, дзе захоўваюцца скарбы чэскіх каралёў, ёсьць сем ключоў. Скарбы гэтыя — некалькіх рэчаў, сымболіку якіх чэхі разумеюць, альбо, як мы кажам, «чуюць». Гэтыя сем ключоў перахоўваюць некалькі прадстаўнікоў улады і Касьцёлу. Такая традыцыя яднае сьвецкія і царкоўныя колы. Цырыманіял паказу гэтых скарбаў мусіць нагадваць, што ёсьць улада ня толькі сьвецкая, але і духоўная. Няма ніякай улады абсалютнай. Гэта важна разумець.

**«НН»: Пасьля рэвалюцыі ў Вас быў шанец пайсьці ва ўладу. Вы яго не скарысталі. Не шкадуеце?**

**В.М.:** Гэта была вялікая спакуса. Я быў першым прэссакратаром «Грамадзянскага форуму». Але калі пачалі вырашацца пытаньні ўлады, я як каталіцкі сьвятар не хацеў у гэтым удзельнічаць. Таму й выйшаў з «Грамадзянскага форуму» праз дзесяць дзён пасьля перамогі. Ні біскуп, ні ксёндз не павінны быць сябрамі нейкай партыі. Яны мусяць заўсёды заставацца незалежнымі. Але гэта ня значыць, што я перастаў цікавіцца палітыкай. Наадварот, стараюся, каб і вернікі цікавіліся важнымі пытаньнямі жыцьця краіны. Я гавару людзям, што яны павінны быць ня толькі вернікамі, але і адказнымі грамадзянамі.

**Запісалі Зьміцер Дзядзенка і Сяргей Ёрш**

СПРЭЧНЫ ВОДГУК

# Wirtschaftsraum для Нямеччыны

Ня ведаю, ці было гэта заплянавана, але выйшла няблага: у нумары «НН» за 25 ліпеня на адной старонцы зьмешчана гутарка зь нямецкім палітолягам Аляксандрам Рарам, а на другой — інфармацыя пра злыбеды лужыцкіх сэрбаў. І ў той самы дзень у «Народнай Волі» — артыкул пра гаспадарчыя праблемы Нямеччыны. Ёсьць што пачытаць, параўнаць, над чым падумаць.

Цікава, што «НН» лічыць сп.Рара «галоўным экспэртам» па Беларусі, Расеі і Ўкраіне. Але, каб быць экспэртам, трэба ведаць мову і гісторыю тае краіны, пра якую трактуеш у сваіх тэкстах. Сп.Рар ані мовы нашае, ані гісторыі ня ведае.

Сп.Рар кажа, што «ў Расеі ідзе дэмакратычны працэс», а ў наступнай калёнцы мы чытаем пра «аўтарытарныя тэндэнцыі ў Расеі». Дык што дзеецца насамрэч? У Расеі, як і ў Беларусі, адбываецца контрарэвалюцыя, толькі ціхая, паўзучая, без рэфэрэндумаў і пабоішчаў на вуліцах. Але самае дзіўнае, што Расея, краіна з аўтарытарнымі тэндэнцыямі, «зацікаўленая ў дэмакратызацыі Беларусі». Гэта нешта новае ў паліталёгіі: аўтакратыя рупіцца пра дэмакратыю.

Сп.Рар і тыя, хто за ім, хочуць, каб ЗША ўзгаднялі сваю палітыку ва Ўсходняй Эўропе з Эўразьвязам і нават спрабуюць запэўніць нас, што «мэты ЭЗ не разыходзяцца з мэтамі амэрыканцаў». Але ж лексыка сп.Рара («Эўропа будзе расхлёбваць») выдае раздражнёнасьць з прычыны амэрыканскае прысутнасьці ў Цэнтральнай Эўропе.

Афіцыйную Нямеччыну і Францыю раздражняе, што «іншае бачаньне Эўропы» мае Італія». Сп. Рар кпіць: «Гэта нешта абсалютна сьвежае, калі італьянскі палітык гаворыць пра будучую Вялікую Эўропу». Калі пра Вялікую Эўропу гаворыць немец, чытаем у падтэксьце, — гэта нармальна, калі італьянец — гэта ненармальна, бо ад такіх размоваў патыхае амэрыканшчынаю.

Нямеччына хацела б разам з Францыяй «заняцца кансалідацыяй Новай Эўропы». Чаму б ім не «патрабаваць ад Польшчы і ад балтыйскіх краінаў» забыцца на ўрокі гісторыі і крыўды, учыненыя ім Расеяй, і весьці ў дачыненьні да Масквы палітыку, выгадную Бэрліну і Парыжу?

У чым сутнасьць новае нямецкае Ostpolitik? Немцы хочуць выкарыстаць прыродныя рэсурсы Расеі. Вось чаму яны зьбіраюцца «патрабаваць ад Польшчы і ад балтыйскіх краінаў» новае ўсходняе палітыкі. Што тычыцца Беларусі, дык Лукашэнкаў рэжым для іх непрымальны толькі таму, што ён ня хоча адкрыць беларускую эканамічную прастору для нямецкага капіталу, гарантаваць недатыкальнасьць уласнасьці, вываз прыбыткаў ці значнае часткі іх. А ці дэмакратычны гэты рэжым — справа трэцяя. У гэтай сувязі сп.Рара вельмі цешыць, што офіс АБСЭ на чале зь немцам Гайкенам «не фігуруе на першых палосах газэтаў». Ён кажа, што газэты паведамляюць пра нейкую працу офісу, але я ніяк не згадаю, каб што пра тую працу ўвогуле чытаў. І дарма Лукашэнка не пускае нямецкага капіталу ў Беларусь: Нямеччына патрабаваць ад яго дэмакратыі ня будзе, і ягоным інтэгрысцкім памкненьням не перашкаджацьме. Ужо і панятак для беларускага рэжыму прыдумалі — «мяккая дыктатура» (людзей б’юць, але не забіваюць; людзі зьнікаюць, але няшмат).

Галоўная перашкода для Нямеччыны ў нашым рэгіёне — амэрыканцы. Па-першае, магутныя эканамічныя канкурэнты. Па-другое, народы Цэнтральнае Эўропы выдатна ведаюць тое, чаго ня ведае сп.Рар: Расея заўсёды зьбліжаецца з Эўропаю ці часткаю яе, калі ёй патрэбныя новыя тэхналёгіі. Аднавіўшы вайскова-прамысловы патэнцыял, яна робіцца небясьпечнаю для заходніх суседзяў. Па-трэцяе, ведаюць, што Нямеччына і пагатоў Францыя не абароняць іх ад расейскага мядзьведзя. Па-чацьвёртае, Цэнтральная Эўропа памятае, што не Нямеччына і ня Францыя прынесьлі ёй вызваленьне ад камунізму.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Паміж небам і зямлёй



IREX-PROMEDIA

Пачалося жніво. Раённае «Адзінства» застракацела паведамленьнямі зь месцаў бітваў за ўраджай. Усе бегаюць, мітусяцца, перажываюць. «Уборачная» дакацілася і да майго калгасу «Бродаўка». Барысаўшчына ніколі не вылучалася асаблівай ураджайнасьцю, а «Бродаўка» і тым болей. Летась мы займалі месца пры канцы, як па колькасьці збожжа, так і па ўраджайнасьці, апярэджваючы хіба што калгас «Чырвонапартызанскі», сёлета на афіцыйным узроўні прызнаны банкрутам, — пра тое нават быў рэпартаж на АНТ.

Камбайнаў у «Бродаўцы» нямнога, дый тыя ня новыя. Зерне высыпаецца з бункераў, але на тое ніхто не зьвяртае ўвагі. Пры такім раскладзе цяжка будзе пераадолець паказьнік 10—15 ц/га. (І гэта пры той умове, калі дапамогуць суседнія гаспадаркі.) З кожным годам плошчы пасеваў зьмяншаюцца — у калгасе засталіся лічаныя людзі, і каб не пэнсійнага веку аграном, невядома, што зь ім было б наагул.

За ўборачнай руплява сочыць 14-гадовы жыхар Менску Алег Заяц, які бавіць свае вакацыі ў вёсцы Старое Янчына. Яму, відаць, як нікому баліць за калгас. Чатыры гады таму Алег, убачыўшы па тэлевізіі, як Лукашэнку падарылі мадэлі камбайнаў «Палесьсе» і «Бізон», напісаў ліст да прэзыдэнта з просьбай падарыць і яму такія «цацкі». У сельсавет прыйшоў адказ з Адміністрацыі. Ён утрымліваў прыкладна такія тэзы: «Мы радыя, што ёсьць яшчэ такія людзі, якім неабыякавая сельская гаспадарка… Але, на жаль, дадзеныя мадэлі былі выраблены для Аляксандра Лукашэнкі ў адзінкавым выглядзе… Спадзяемся, што твая зацікаўленасьць сельскай гаспадаркай дазволіць табе зрабіць правільны выбар...» Пасьля старшыньцы сельсавету прыйшлося несалодка — выклікалі то ў райвыканкам, то яшчэ куды. Маўляў, чаго дзіцяці ў жыцьці не хапае.

Дарэчы, чаму калгас завецца «Бродаўка», а не «Кастрыца», калі адміністрацыйны цэнтар знаходзіцца ў маёй вёсцы? Ходзіць такое гумарыстычнае меркаваньне. Недзе ў 50-я старшынька калгасу Зося Ластоўская на адной з разнарадак кінула фразу, якая пазьней стане ці ня культавай: «П...ц Кастрыцкаму калхозу». Даўна няма Зосі, а фраза ўсё яшчэ ходзіць у людзях. Вось і калгас завецца «Бродаўка», каб пазьбегнуць непрывабных асацыяцыяў.

І ўсё адно ён ледзьве ліпіць. У гаспадарцы засталося ўсяго некалькі трактарыстаў. Бо зарабіць грошай у калгасе немагчыма: увесь час плацяць з затрымкаю ў некалькі месяцаў. Хтосьці едзе на заробкі ў Барысаў, іншыя працуюць у лесе, дзе можна атрымаць неблагі грош. Зрэшты, адзін зь нядаўніх старшыняў здолеў гэта зрабіць і ў калгасе: абяцаў падняць гаспадарку, своечасова разьлічвацца з працоўнымі, гаварыў, што мае нейкія сувязі з цэхамі. А ўрэшце, папрацаваўшы з тыдзень, узяў зь бюджэту калгасу мільён рублёў, якія нібыта пасьпеў тут зарабіць, і з спакойнай душой звольніўся. Не спрачаюся — грошы невялікія, але ж дай ты іх людзям, якім заробак калі і аддавалі, дык прадуктамі. Тады і пайшла па вёсцы показка: старшынём калгасу можа быць кожны, галоўнае — сказаць, што ёсьць сувязі з цэхамі, а ўжо пасьля рабі што хочаш.

Нядаўна прайшоўся да фэрмы па грыбы, бо тут растуць шампіньёны, дык напароўся на шкілет беднай худобіны. Адзін, бо астатнія ў блізкім лесе. Летам у ім немагчыма зьбіраць ягады: стаіць надзвычайны смурод.

Мэханічнага стану, які існаваў яшчэ некалькі гадоў таму, ужо няма. Спачатку мясцовыя вынаходнікі павыкручвалі з таго, што заставалася, больш-менш патрэбныя дэталі. А гэтай вясной здалі ў мэталалом тое, што засталося. На стане зусім ня стала жалезьзя, таму ён і выглядае пустынным. Хоць, зрэшты, не, сёлета моладзь у ранейшай майстэрні зрабіла пляцоўку для гульні ў баскетбол. Значыць, пэрспэктыва ў вёскі будзе.

Відавочна, калгас «Бродаўка» дажывае апошнія дні. Людзям, дарэчы, бяз розьніцы, ці яго расфармуюць па іншых гаспадарках, ці аддадуць фэрмэру, хоць нашаму, хоць замежніку, — абы зямля не пуставала. Вось галоўны прынцып сёньняшняй вёскі.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

## Крэсла для старшыні

**У Аршанскім раёне дзеля рэзкага зьніжэньня вытворчасьці сельскагаспадарчай прадукцыі працягваюцца «чысткі» кіраўнікоў.** Толькі ў апошні час за вялікую запазычанасьць у заробках ды іншыя недагляды ў працы зьнятыя з пасадаў дырэктар саўгасу «Дняпро» і старшыня калгасу «Чырвонае аб'яднаньне». Незайздросны лёс чакае яшчэ некалькіх кіраўнікоў адсталых гаспадарак. Але кадравыя пераструсы праблемаў не вырашаюць. Гаспадаркі з кожным месяцам усё больш бяднеюць. Дайшло да таго, што ў некаторых няма нават сродкаў, каб набыць крэсла ў кантору. Старшыня райвыканкаму параіў з трыбуны: можна здаць карову на мясакамбінат і на атрыманыя грошы купіць крэсла для старшыні. Толькі ці хопіць кароваў, каб вырашыць усе праблемы?

## У цэрквах дарагоўля


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Вернікі, якія сабраліся ў аршанскіх праваслаўных храмах на дзень памінаньня памерлых, былі непрыемна зьдзіўленыя, калі даведаліся, што кошт абраду памінаньня ўзрос адразу зь дзьвюх да пяці тысячаў рублёў.** Шмат якія вернікі, а гэта збольшага пэнсіянэры ды маламаёмасныя, пайшлі з храмаў, так і не памянуўшы памерлых продкаў. Ніякіх тлумачэньняў ад служкаў яны не пачулі. Пакрыўджаныя вернікі скардзіліся ў мясцовыя органы ўлады ды дзяржаўную прэсу. Дарэчы, нятанныя й кошты на іншыя царкоўныя абрады (цэньнікі вывешаныя ў храмах, як у цырульнях): вянчаньне каштуе 40 тыс., хрышчэньне — 25 тыс., адпяваньне — 30—45 тыс.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Сэрвач пахне тухлізнаю

**Ад вялікіх дажджоў вада ў нашай Сэрвачы паднялася была мэтра на паўтара.** Там, дзе было па калена, зрабілася ледзь не з галавою. А плынь такая, што на нагах ня ўстоіш. Во, думалі, наплаваемся сёлета! Але тыя праліўні ўсё і сапсавалі: разьдзьмуўшыся, рака заліла балоты недзе ў Глыбоцкім ці Докшыцкім раёнах і «прыхапіла» адтуль стаячую ваду. Эфэкт быў трагічны: скрозь паўсплывала ўверх брухам рыба (дзе-нідзе яе лавілі ды елі). Прыяжджалі экологі зь Мядзелу і зь Менску, зрабілі аналізы і высьветлілі, што рыба папросту задыхаецца: у балотнай вадзе мала кіслароду. А больш ніякіх атрутных рэчываў у рацэ ня выяўлена. Але купацца пакуль усё адно брыдкавата: вада сьмярдзіць тухлізнаю. Не шанцуе Сэрвачы: гадоў з адзінаццаць таму непадалёк ад яе адбылася аварыя прадуктаправоду і ў раку вылілася тоны саляркі — таксама рыба мерла і купацца не было як. Але тады лета было не такое гарачае. А ад сёлетняй духаты часам хоць ты ў студню хавайся.

**Вацлаў Зьвяруга, Будслаў**

## Doktarka-maniuka

**Baranavickaja kabieta źviarnułasia ŭ veneryčny dyspanser na pravierku.** Analizy ničoha nia vyjavili. Adnak chitraja doktarka, daviedaŭšysia niejkija padrabiaznaści, zrazumieła, što pacyjentka budzie maŭčać. I skazała kabiecie, byccam by taja chvoraja na niepryhožuju chvarobu. Za «lekavańnie» i ananimnaść zapatrabavała 100 dalaraŭ. Nieviadoma, jak jana tam «lekavała», tolki praz peŭny čas klijentka pačała niešta padazravać... Doktarku zatrymali milicyjanty, raspačataja kryminalnaja sprava.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

## У Пінску на пікеце

**25 ліпеня ў Пінску быў пікет, прысьвечаны дзевяцігодзьдзю знаходжаньня ва ўладзе прэзыдэнта.** Пікет прайшоў без эксцэсаў, міліцыянты зычліва віталіся з удзельнікамі, мерапрыемства здымаў мясцовы тэлеканал. Нечаканай была рэакцыя людзей, звычайна яны абыякава крочылі па сваіх справах, а гэтым разам падыходзілі, выказвалі падтрымку. Асабліва ўразіў адзін пінчук, якому налічылі вялізную суму падаткаў на будынак: ён проста перад тэлекамэрай парваў паперы з падатковай.

**Васіль Мацкевіч, Пінск**




# Адчыняйце прыватныя бібліятэкі



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

**Ад падпіскі на незалежныя выданьні адмовіліся ў другім паўгодзьдзі бібліятэкі Воршы.** Міністар культуры Леанід Гуляка, які наведаў горад у траўні, прыгразіў асабіста звольніць з працы дырэктарку Аршанскай ЦБС, калі даведаецца, што бібліятэкі атрымліваюць незалежную прэсу, хай сабе і на пазабюджэтныя сродкі й нават на спонсарскія грошы. На заўвагу бібліятэкараў, што дэмакратычныя выданьні карыстаюцца значным чытацкім попытам, высокі начальнік параіў ахвотным набываць іх у шапіках ды адчыняць прыватныя бібліятэкі. У «чорны сьпіс» трапілі «Народная воля», «БДГ», а таксама абласная незалежная газэта «Витебский курьер».

**ЯЖ**

# Расплата бяз тэрміну даўнасьці

**Яны імкнуліся навесьці парадак у краіне любой цаной. Іхнімі ворагамі былі «элемэнты, якія спрабуюць разбурыць асновы заходняй хрысьціянскай цывілізацыі». Калі аргентынская дыктатура зганьбіла сябе бясслаўнай паразай на Фалклендах, яны аддалі ўладу парлямэнту. Але па-ранейшаму займалі дзяржаўныя пасады, служылі ў войску і адзін за адным сустракалі бязьбедную старасьць. Судзьдзя Гарсон і прэзыдэнт Кіршнэр спынілі ім гэтую ўцеху. У Аргентыне арыштоўваюць ня толькі былых дыктатараў, але і ўсіх афіцэраў, чые рукі ў крыві.**

Жыхары Аргентыны называюць пэрыяд з 1976 да 1983 г. «бруднай вайной». Тады ў Аргентыне правіла баль хунта. Яе ахвярамі зрабіліся больш за 9000 чалавек, якія былі арыштаваныя, закатаваныя ці бясьсьледна зьніклі.

Бясхмарныя часы для падручных дыктатараў скончыліся ў траўні. Да ўлады прыйшоў новы прэзыдэнт Нэстар Кіршнэр. Ён паабяцаў скончыць з «культурай беспакаранасьці». У мінулую пятніцу прэзыдэнт адмяніў дзеяньне ўказаў 1986 і 1987 г. (Punto Final і Obediencia Debida), якія абаранялі былых вайсковых афіцэраў, абвінавачаных у парушэньнях правоў чалавека ў гады дыктатуры, ад экстрадыцыі ды судоў за межамі краіны. Рашэньне прэзыдэнта было прынятае адразу пасьля таго, як фэдэральны судзьдзя загадаў затрымаць 45 былых афіцэраў і аднаго цывільнага, выдачы якіх патрабуе Гішпанія. Рашэньне прэзыдэнта ўвойдзе ў сілу, калі яго ўхваліць Вярхоўны Суд. Ён цяпер гэтым і займаецца. 65% аргентынцаў падтрымліваюць рашэньне Кіршнэра, хоць ад


AP

Прэзыдэнт Аргентыны Нэстар Кіршнэр

часу падзеньня дыктатуры прайшло ўжо 20 гадоў. Калі б тое самае зрабілі ў іншых кутках сьвету, магчыма, злачынствы дзеля ўлады здараліся б ня так часта.

Да апошніх прэзыдэнцкіх выбараў, пятых пасьля мірнага падзеньня вайсковага рэжыму, ніхто ня верыў у тое, што злачынцы будуць пакараныя. Толькі два з сарака пяці галоўных дзеячоў хунты знаходзіліся ў Аргентыне пад хатнім арыштам. Летась Аргентына адхіліла патрабаваньне Швэцыі выдаць былога капітана Альфрэда Астыза, мянушка якога — «Анёл сьмерці».

Большасьць хунтыстаў ужо старыя, таму сардэчныя прыступы пасыпаліся што гарох. Адзін з афіцэраў нават трапіў у шпіталь у крытычным стане, паспрабаваўшы застрэліцца.

Гішпанія вінаваціць хунтыстаў у злачынствах, якія яны зьдзяйсьнялі падчас «бруднай вайны». Сярод ахвяраў рэжыму было шмат замежных грамадзянаў, у тым ліку некалькі сотняў гішпанцаў, але судзіць хунту будуць за ўсе яе злачынствы, згодна з прынцыпам унівэрсальнага правасудзьдзя. Ён прадугледжвае, што да адказнасьці за злачынствы супраць чалавецтва, генацыд, катаваньні і г.д. можна быць прыцягнутым у любой краіне.

## Правасудзьдзе бязь межаў

Гішпанскае заканадаўства дазваляе судзіць вінаватых у генацыдзе нават тады, калі яны зьдзяйсьнялі злачынствы ў іншых краінах. Судзьдзя Бальтазар Гарсон, ініцыятар справы, у 1998 г. паспрабаваў дамагчыся выдачы Аўгуста Піначата, але беспасьпяхова. Брытанская паліцыя арыштавала чылійскага генэрала і зьбіралася перадаць Гішпаніі, але праз два гады мэдыкі пастанавілі, што ён ня здолее перанесьці суд. Піначат вярнуўся ў Чылі. Цяпер яго завочна судзіць французскі суд.

Першае перамогі Гарсон дамогся ў чэрвені. Мэксыканскія ўлады выдалі Гішпаніі аргентынскага афіцэра Рыкарда Кавала, зьвязанага з хунтай. Калі Гарсон узяўся за Піначата, зь ягонага імпэту сьмяяліся, называючы яго «Дон Кіхотам». Сёньня Дон Кіхот перамог.

Нярэдка былыя ўладцы зьбягаюць з радзімы, дый ня кожная дзяржава судзіць сваіх былых дыктатараў ды катаў. Але прынцып унівэрсальнага правасудзьдзя не дае злачынцам спаць спакойна. Найактыўней карыстаюцца ім Гішпанія, Бэльгія, скандынаўскія краіны.

Прынцып той быў закладзены пасьля другой сусьветнай вайны, калі судзілі ваенных злачынцаў. Потым надышла доўгая паўза, якая зрэдку перапынялася адзінкавымі справамі, як суд над Адольфам Айхманам у Ізраілі.

У 90-я судовых разьбіральніцтваў зноў паболела. У Бэльгіі былі арыштаваны і асуджаны за генацыд руандыец Вэнсэн Нтэзімана. У 1997 г. нямецкія суды адправілі ў вязьніцу сэрбскіх вайскоўцаў Навіслава Джаджыча ды Міколу Джоргіча за генацыд у Босьніі. А ў Даніі басьнійскі мусульманін Рэфік Сарыч адбывае васьмігадовае зьняволеньне за катаваньні. Нядаўна засудзілі на 45 гадоў турмы чатырох афіцэраў былой Арміі вызваленьня Косава. Францыя судзіць руандыйскага сьвятара Вензэсляса Муньешаку за генацыд ды катаваньні. Там таксама быў арыштаваны маўрытанскі палкоўнік Элі Оўлуд Да, які праходзіў навучаньне ў французкай вайсковай школе. Два маўрытанцы прызналі ў ім свайго ката. У лютым 2000 г. у Сэнэгале была распачатая справа супраць выгнанага дыктатара Чаду, Хісэна Хабрэ, якога цяпер чакае суд. Упершыню ў гісторыі афрыканскага дыктатара судзіць іншая краіна свайго ж кантыненту.

## Дыктатары пакараныя і непакараныя

Судзяць злачынцаў супраць чалавечнасьці ня толькі за мяжой, але і дома. Посткамунстычныя краіны Эўропы пераважна не сьпяшаюцца караць былых камуністычных лідэраў, каб не распальваць жарсьцяў. Аднак ёсьць і выняткі. У чэрвені праскі суд пасадзіў на чатыры гады былога камуніста Карэла Гофмана за ролю, якую ён адыграў ва ўварваньні савецкага войска ў Чэхаславакію ў 1968 г. Нямеччына прызнала гэдээраўскага функцыянэра Эгана Крэнца вінаватым у тым, што ён аддаваў загады страляць па ўцекачах праз «бэрлінскую сьцяну». Былы баўгарскі лідэр Тодар Жыўкаў правёў першую палову 90-х пад хатнім арыштам. У Альбаніі пасадзілі ў турму амаль усё палітбюро, аднак выпусьцілі празь некалькі год.

У Сэрбіі 8 ліпеня ўступіў у дзеяньне новы закон, які стварае адмысловы пракурорскі орган для вышуку ваенных злачынцаў у краіне. Супраць яго стварэньня галасаваў у парлямэнце блёк прыхільнікаў Слабадана Мілошавіча, па справе якога ў Гаазе дагэтуль ідзе працэс.

Найбольш жорстка з экс-лідэрам абышліся румыны: Мікалае Чаўшэску ды ягоная жонка былі расстраляныя. Зусім нядаўна ў Румыніі засудзілі на 22 гады турмы двух былых супрацоўнікаў «Сэкурытатэ», якія ў 1985 г. зьбілі да сьмерці дысыдэнта Георге Урсу. Праўда, злачынцы зьбеглі ды недзе хаваюцца. Цяпер і яны, як калісьці іх ахвяры, пакаштуюць страху перад арыштам ды турмой.

Але шмат якія тыраны і дагэтуль застаюцца без пакараньня. Гэтак, былы дыктатар Уганды Іды Амін памірае ў шпіталі Саудаўскай Арабіі, у якой ён пражыў апошнія 25 гадоў. Ягоны пераемнік Мілтан Аботэ жыве ў Замбіі. Былы дыктатар Гаіці Жан-Клёд Д'ювальe хаваецца ў Францыі. Эфіёпскага Мэнгісту прытуліў ягоны калега па цэху тыранаў прэзыдэнт Зымбабвэ Робэрт Мугабэ. Альфрэда Стрэснэр адпачывае ў Бразыліі ад 35-гадовага кіраваньня Парагваем. Забі аднаго чалавека — трапіш у турму. Забі дваццаць чалавек — трапіш у вар'ятню. Забі дваццаць тысяч — трапіш за стол мірных перамоваў ці ў ганаровую высылку. Хоць гонар тут сумнеўны: жыві і бойся, што дацягнуцца рукі правасудзьдзя ці кагосьці з былых паплечнікаў, якім ня трэба лішні сьведка.

**Алесь Кудрыцкі**



Аргентынскія генэралы і палітыкі, на якіх трымалася хунта



# Мозг выбірае родную мову ў дзевяць месяцаў

**Чаму генэрал Грыб лёгка перайшоў на беларускую мову, а шчыры, сьведамы адраджэнец Юры Хадыка дагэтуль гаворыць па-беларуску, зь цяжкасьцю падбіраючы словы? Чаму сынтаксіс маўленьня «гаранта канстытуцыі» такі непапраўна блытаны? Чаму рытм расейскага маўленьня большасьці гарадзкіх беларусаў запаволены? Магчыма, разгадку даюць вынікі працы дасьледчыцы Патрыцыі Куль, апублікаваныя ў «Proceedings of the National Academy of Sciences».**

Усьведамленьне таго, якая мова родная, а якая не, западае ў дзіцячы розум задоўга да першага «мама». Між шостым і дванаццатым месяцамі жыцьця немаўля мае слабыя «моўныя прыярытэты» і здатнае да засваеньня любой мовы. Але тая здольнасьць пачынае хутка зьнікаць на дзясятым месяцы жыцьця. Але гэтую функцыю мозгу немаўляці можна ўзмацніць і падтрымаць, піша дасьледчыца.

Дзеля экспэрымэнту яна запрашала да дзевяцімесячных ангельскіх дзяцей выкладчыка кітайскай мовы, які зь імі гутарыў, гуляўся. У хуткім часе немаўляты пачыналі лічыць кітайскую мову роднай, хутчэй яе засвойвалі. У дзяцей кантрольнае групы, зь якімі працягвалі гаварыць па-ангельску, здольнасьць да вывучэньня моваў, між тым, хутка занепадала. Наш мозг за першыя месяцы мае вызначыцца, якую мову лічыць роднай, але, нечакана «атакаваны» іншай моваю, адцягвае момант таго канчатковага выбару.

Прычым найлепш іншая мова засвойваецца празь непасрэдны кантакт з выкладчыкам. (Каб гэта спраўдзіць, дзяцей падзялілі на дзьве групы: адны чулі кітайскую з тэлевізару ці магнітафону, да другіх прыходзіў «жывы» выкладчык. У першых здольнасьць да вывучэньня мовы моцна аслабела.) Падчас гутарак настаўнік і дзевяцімесячны «вучань» глядзяць на адны й тыя самыя прадметы, дакладна ведаючы, пра што йдзе «гаворка», ніводзін з бакоў не застаецца пасіўным да дзеяньняў іншага. Гэтага немагчыма дасягнуць падчас навучаньня з аўдыёшколаў, гаворыць П.Куль.

Настаўнік падладжваецца пад дзіця, засяроджвае ўвагу на націсках, фразы, якія ён гаворыць, прасьцейшыя ад «касэтных», яны ня ўтрымліваюць абстрактных рэчаў. Можа быць, так гучала мова нашых далёкіх продкаў: убога, але канкрэтна, проста, але выразна.

Дасьледчыца параўноўвае чалавека, які вывучае мову без дапамогі яе носьбітаў, з ізаляваным ад суродзічаў птушанём, «якое ніколі не навучыцца добра сьпяваць».

Але як спраўдзіць, што дзіця сапраўды разумее чужую мову? Само ж яно ня скажа. Навукоўцы рабілі такі экспэрымэнт: дзіцяці паўтаралі якоесьці слова, раз-пораз мяняючы яго на іншае. Падчас зьмены немаўляці паказвалі цацку (прыкладам, мышаня, якое хаваецца ў норку). Але, каб яе ўбачыць, немаўля мусіла павярнуць галоўку. Усе «кітайцы» прайшлі тэст без праблемаў. «Ангельцы» паварочваліся адвольна.

Вось і адгадка «фэномэну Багдановіча»... Апісаная зьвяга можа патлумачыць і тое, чаму большасьць беларусаў нашмат павольней ад этнічных расейцаў гаворыць па-расейску. Дый калі першы год жыцьця дзеці «гарадзкіх-рускіх» бавяць разам зь вясковымі дзядамі ды бабамі, яны таксама будуць успрымаць беларускую мову як родную. Адным словам, бацькі-беларусы мусяць гаварыць зь немаўлятамі па-беларуску, калі яны хочуць, каб дзеці засталіся ў «веры» сваіх бацькоў. А не пакідаць навучаньне мовы на «сьветлае заўтра».

**Франц Субель**

Уладзімер Някляеў

прыпавесьць

# Чмель і вандроўнік



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

*На саракавіны В.Б.*

Чмель паміраў. Так сталася, што пад дзень нараджэньня.

Ён быў мудрым чмялём — і ведаў, што рыбы, птушкі, зьвяры і ўсё, што нараджаецца — памірае: і людзі, і кветкі, а таму, мусібыць, і чмялі, але ня ведаў, як і што пасьля, і трохі баяўся...

Таму яму падумалася, што ёсьць чмяліны Бог.

Ён быў мужным і моцным чмялём, жыў невыносна доўга і не стаміўся невыносна доўга жыць, аблётаўшы ці ня ўвесь чмяліны сьвет і яшчэ схадзіўшы на вайну. Вайна была вялікай, але ня большай за сьвет, і ён зьдзівіўся.

І яшчэ зьдзівіўся, што яна, вайна, яму не замінала.

«Тады што ж, — ён падумаў, — можа замінаць?..» І выходзіла, што нічога.

Адна сьмерць.

«Але ж ня можа яна, сьмерць, — ён думаў, — быць большай за жыцьцё?.. Як вайна ня можа быць большай за сьвет».

Мудрасьці, каб падумаць інакш, не хапіла. Ён зразумеў, што ў тым, пра што падумаў, няма мудрасьці. «Тады дзе яна і ў чым?...»

Выходзіла, што, калі ня ў ім, у чмялі, тады ў чмяліным Богу.

Тут узьнікала праблема: пра тое, чым ёсьць Бог, падумалася, але веры ні ў чмялінага, ні ў якога іншага Бога ў чмялі не было.

Бог, які быў у чмялі, думаў: што рабіць з чмялём? Да Бога чмель, хоць Бог быў у ім, так і не дабраўся, пастанавіўшы, што Бога няма, а ёсьць толькі жыцьцё, вайна і сьмерць. Але зямны свой наканаваны шлях чмель прайшоў прыстойна. Больш прыстойна, чым многія і многія з тых, хто верыў, што Бог ёсьць. У Бога ўзьнікала праблема...

Цераз тры сьцяны ад чмяля паміраў у тым жа шпіталі ад той жа хваробы авадзень. Ён быў такім аваднём, пра якога і сказаць, і падумаць можна хіба толькі тое, што ён авадзень. І ўсё ж у ім хапала аваднёвага розуму, каб дапяць, што, хоць ён і авадзень, але калі паміраюць птушкі, рыбы, чмялі, дык, мусіць, памрэ і ён. Яму было гэтак страшна, што ён толькі прасіў і прасіў, маліў і маліў Бога, каб ня даў памерці.

Бог, які быў у чмялі, паклікаў да чмяля вандроўніка, якога чмель некалі ўджаліў. Вандроўнік крыўдаваў на чмяля і ня надта хацеў ісьці. Але за гады вандроўніцтва ён зрабіў крок да Бога, таму пайшоў, куды Бог паклікаў.

У дарозе ў вандроўніка ўзьнікла праблема: з чым прыйсьці да таго, хто памірае? І ў каго заўтра дзень нараджэньня. Што прынесьці ў падарунак? Залаты гадзіньнік?..

На рынку да вандроўніка падышла бабуля ў белым і падала суніцы на сунічніку. Маленькі букецік з чырвонымі ягадамі. «Табе гэта?..» — спытала бабуля, і вандроўнік успомніў, што аднойчы хадзіў з чмялём у суніцы. Пакуль ён шукаў у кішэнях, каб разьлічыцца, грошы, бабуля павярнулася і хуценька пайшла. Вандроўнік кінуўся яе даганяць, бубуля давяла яго да крамы з кветкамі і ў кветках прапала.

Квятнярка спытала: «Вам колькі?»

Вандроўнік ня ведаў колькі... Пяць? Сем? Сто?

Квятнярка стаяла на парожку сваёй крамы, зрабіла крок уніз, аступілася і, каб ня ўпасьці, ухапілася за безьліч руж, выхапіўшы зь іх адну. Знайшла раўнавагу і ня ўпала.

Вандроўнік купіў адну тую белую ружу і паехаў у шпіталь. Дарогай, каб заняць час, думаў пра тое, як хораша ўсё ён прыдумаў. З суніцамі, з ружай...

Авадзень, баючыся, што Бог пра яго ня ўсё помніць, нагадваў Богу, як аднойчы поп з той вёскі, дзе нарадзіўся авадзень, папрасіў яго, аваднія, дапамагчы збудаваць царкву, і як ён, авадзень, пастараўся. Тэхніку загадаў прыгнаць, цэглу і цэмэнт завезьці, і нават золата на пазалоту... І як поп яму дзякаваў і бажыўся, што ўсе грахі яму, аваднію, за тое будуць адпушчаныя.

Яшчэ авадзень нагадаў Богу, што падаваў міласьціну. Часта, амаль заўсёды, калі здаралася напаткаць жабрака альбо жабрачку. Хіба Бог таго не заўважаў?..

У палату ўвайшоў доктар. Авадзень ня ведаў яго, першы раз бачыў. Доктар падышоў да акна, якое само расчынілася, і сказаў у акно: «Храмы, што будуюцца не са свайго, не стаяць. Міласьціна, якая падаецца дзеля сябе, не ратуе».

Авадзень хацеў нешта спытаць, але ня ведаў што і не знайшоў у каго. У расчыненае акно ўляцела парушынка і зазірнула пустата.

На калідоры каля палаты, у якой паміраў чмель, сядзеў сьвятар. Ён прыходзіў і сядзеў тут штодня ўжо тыдзень, чакаючы, калі чмель яго пакліча, каб далучыцца да Бога праз таямніцу споведзі. Чмель ня клікаў...

— Як сёньня?.. — спытаў сьвятар доктара, і доктар паціснуў плячыма.

Чмель адчуваў у сабе — там, дзе тое, што звычайна называюць душой, — нязвыклы рух, нейкі такі, нібы ў ім, у чмялі, яшчэ адзін чмель і ўніз, і ўверх, і адразу ва ўсе бакі лётае, і стаў ціха да руху, да сябе ў сабе самім прыслухоўвацца: ці не пачуецца выразны гук?.. Але не: рух быў як адразу ўверх, і ўніз, і ва ўсе бакі — так адразу ва ўсім, няўцямны ў сабе самім, і ў ім яшчэ нешта было, і яшчэ нешта...

«А можа быць...» — падумаў чмель — і далей ня стаў пра гэта думаць, падлавіўшы сябе на слабасьці.

Вандроўнік згадаў, як везьлі яго аднойчы гэтай дарогай — туды, дзе паміраў цяпер чмель. Як правозілі на машыне хуткай дапамогі міма гарадзкіх больніц — і як ён кожнага разу спадзяваўся, што вось да гэтай больніцы, не далей, і як у ім сьціналася ўсё, калі далей і далей, і ўрэшце да самай дальняй, у якую кладуць з той хваробай, ад якой амаль непазьбежна канаюць, і як ён ня мог выйсьці, калі давезьлі, з машыны, так абліўшыся ўспацелым страхам, нібы да ніткі вымак пад дажджом.

Аўтобус, у якім ехаў вандроўнік, раптам ссунуўся на абочыну, і яго пачалі абганяць машыны: з сырэнамі, зь міргалкамі — на шалёнай хуткасьці адна, другая, дзясятая, адна за адной... Чмель займеў славу ў чмяліным сьвеце, але ў Айчыне сваёй быў біты камянямі, і вандроўнік падумаў у зьдзіўленьні: «Няўжо да чмяля?..» Гледзячы ў пыл, узьняты машынамі, ён успомніў, як прагнуў гэтага пылу, за што чмель яго і ўджаліў.

Чмель успомніў пра вандроўніка, калі ў падворак шпіталю пачалі ўкочвацца машыны: з сырэнамі, зь міргалкамі — адна, другая, дзясятая, адна за адной... Чмель не чакаў, што яны да яго, ён наагул нікога не чакаў — і вандроўніка, пра якога ўспомніў. Толькі падумаў: «Чаму?..»

Увайшоў доктар і зачыніў акно:

— Я сказаў ім, што сюды на машынах нельга, але яны ўсё адно панаехалі.

— Хто яны?.. — спытаў чмель, і доктар адказаў, выходзячы:

— Я ж кажу: машыны. Да авадня.

Перш чым зайсьці да чмяля, вандроўнік зазірнуў да доктара. Спытаў — калі чмель памрэ?..

Доктар сказаў, што, можа, сёньня. А, можа, дні праз тры.

— Ён баіцца? — спытаў вандроўнік.

— Усе баяцца, — адказаў доктар. — Але хто як.

Вандроўнік папрасіўся ў доктара перасядзець крыху ў яго. Падумаць, як да чмяля ўвайсьці, як павітацца, што сказаць... Доктар паўтарыў: «Ён можа памерці зараз».

На калідоры вандроўніка пераняў сьвятар.

— Скажы яму, каб паклікаў мяне, — з мальбою папрасіў сьвятар вандроўніка. — Скажы, бо ён не разумее...

Вандроўнік падумаў, што чмель ня можа не разумець, і сказаў сьвятару:

— Ён ня можа не разумець.

— Вы даўно ў суніцы не хадзілі... — падышоў вандроўнік да ложка, на якім паміраў чмель. Той узяў сунічнік, сарваў ягаду, раскусіў — і з куточка роту пакацілася, пакідаючы сьлед на белай бальнічнай шчацэ, на падбародку, сунічная крывінка.

— Праўда... даўно... — даўка пракаўтнуў чмель, а вандроўнік ня ведаў, што рабіць з крывінкай: выціраць ці не?.. Паглядзеў на жонку чмяля, руплівую пчалу, — тая займалася ружай, ставіла яе ў вазу.

— Вытрыся, — сказала пчала чмялю. Той выцерся, паклаў каля сябе сунічнік і паглядзеў на ружу.

— Колькі і чаго кожнаму трэба?.. — спытаў чмель не ў пчалы і не ў вандроўніка. І адказаў ня ім. — Адно жыцьцё, адна сьмерць, адна кветка...

Вандроўніку стала ніякавата. Да сораму. Усё, што ён так і столькі прыдумляў, за што сябе хваліў, чмель раскусіў за імгненьне, як ягаду. Таму вандроўнік сказаў тое, чаго не сказаў бы, калі б яму ня стала ніякавата. Да сораму.

— Даруйце, што змусіў вас некалі мяне ўджаліць.

Чмель павярнуў сівую галаву на высокай падушцы і ўтаропіўся ў сьцяну. Доўга глядзеў у сьцяну і маўчаў. Пакуль ня выдыхнуў празь сілу, як выціснуў зь сябе:

— Дзякуй.

Усё было сказана, больш між імі не было нічога... Вандроўнік прыпадняўся, каб пацалаваць чмяля і

пайсьці, але чмель спыніў яго, узяўшы за руку:

— Пачакай... Я ня ведаю...

Вандроўнік разгубіўся, бо таксама ня ведаў. Толькі здагадваўся. I яму здавалася, што чмель ведае... Павінен ведаць.

— Пра што вы там? — занепакоілася пчала, і ў дзьверы зазірнуў доктар, паклікаў яе, нечым заняў.

Вандроўнік глядзеў чмялю ў вочы, бачыў там сьмерць і ня цяміў, што рабіць... Бог, які прывёў вандроўніка, падказаў: «Скажы яму, што сьмерці няма».

— Я іншым разам чую галасы, — стаў казаць вандроўнік тое, што падказваў Бог, — і ўчуў аднойчы голас дзеда: «Прыяжджай...» Я далёка быў і ехаў доўга, да таго ж многа гадоў мы ня бачыліся, а дзед спаткаў мяне на падворку так, нібы я на хвіліну да суседзяў зьбегаў. Кіўнуў на дрывотню: «Набяры бярэмя і паднясі ў лазьню».

— Гэта калі было? — нечакана спытаў чмель, і вандроўнік адказаў, што зімой, і ён наскрозь прамерз, пакуль дабраўся.

Чмель сказаў: «Цяпер лета...» Болей нічога ён не пытаўся, і вандроўнік, пачакаўшы, стаў казаць далей.

— У лазьні я трохі папарыў дзеда, памыў, ён апрануўся ў белае сподняе, і мы селі ў сенцах. Дзед паклаў на лаву скібку сала, акраец хлеба, паставіў гарнец самагонкі, кілішкі... Калі я наліў, ён падняў кілішак і сказаў ціха, звычайна: «Дзякуй, што прыехаў. Сёньня ўночы я памру».

Вандроўнік замаўчаў, спалохаўшыся прамоўленага, але ні чмель, ні Бог яго не спынілі. Чмель глядзеў і чакаў...

— Дзед, ты што! Мы сто разоў з табой яшчэ вып'ем! — пачаў я абдымаць і цалаваць дзеда, а ён сядзеў ды ківаў: «Добра... добра...»

Ідучы ў хату, дзед прыпыніўся каля драбіны на гарышча. Сказаў: «Злазь. Там у куце пад самай страхой стаіць куфэрачак, вазьмі яго».

Я злазіў і ўзяў. Зялёны куфэрачак з пацёртым медным замочкам.

У хаце дзед адамкнуў куфэрачак і дастаў тое, што ў ім было. «Эвангельле» і «Ўрок Закону Божага». Сказаў: «Па адной кнізе я вучыўся жыць, па другой жыў. Больш мне няма чаго табе пакінуць».

Куточак роту, зь якога выкочвалася сунічная крывінка, торгнуўся ў чмяля, і вандроўнік зрабіў паўзу...

— Дзед хадзіў на вайну? — спытаў чмель.

— Так. Ізь Сьвятым Пісьмом.

Чмель зірнуў недаверліва.

— Не на вашу вайну, — сказаў вандроўнік. — На тую, якая была перад вашай.

Чмель кіўнуў.

— У хаце, апроч мяне і дзеда, дыхала шмат людзей: дзед склікаў усіх сваіх сыноў і дачок зь іх дзецьмі, але не сказаў ім нашто. Яны думалі, што на дзень нараджэньня, які павінен быў настаць заўтра, — і ўсе спалі на чыстай палавіне, позна ўжо было. Ложак дзеда стаяў на чорнай палавіне — каля печы, саганоў, карыта з паранкай...

Чмель слаба ўсьміхнуўся:

— Выпіхвалі старога. Звычайная рэч...

— І ў галаве вісеў абраз, пад якім ён папрасіў мяне, лёгшы і склаўшы рукі, запаліць сьвечку. Я запаліў і падаўся спаць у бакоўку, дзе ня мог заснуць, падняўся, каб пайсьці ў двор пакурыць, выйшаў на чорную палавіну — і дзед на маіх вачах заплюшчыў вочы, усьміхнуўся і памёр. I адразу ж пагасла сьвечка.

Паўза ўзьнікла сама па сабе, і чмель спытаў вандроўніка:

— Табе стала страшна?

— Не, — адказаў вандроўнік. — Мне стала сьветла. Я ня бачыў столькі сьмерцяў, як вы, але ўсё ж некалькі бачыў, і там было страшна, а тут — сьветла. Толькі я ня ведаў, што мне з гэтым рабіць, і зноў схаваўся ў бакоўку. Там скурчыўся, скруціўся, як у дзяцінстве, падцісьнуўшы калені, і пачаў маліцца. Стаў маліць дзеда, каб пра тое, што я толькі што ўбачыў, ён мне яшчэ і расказаў. Ці неяк паказаў, давёў, што так яно і ёсьць, хоць я разумеў, што нельга... але дзед, дзед, я маліў, я так цябе любіў, ты так мяне любіў, дык скажы, што так ёсьць, хоць адтуль казаць нельга... але ты сьвяты, табе даруецца, а мне так трэба ведаць...

Чмель сьцісьнуў руку вандроўніка трохі мацней.

— З той малітвай, з тою просьбай, павярнуўшыся на сьпіну і склаўшы, як дзед, рукі, я раптам адчуў сябе не адным. Узьняўся над сабой самім і ўбачыў сябе самога ў бакоўцы, дзе ляжаў на тапчане, склаўшы рукі, — выразна сябе ўбачыў, усяго да драбніц, хоць там, дзе я ляжаў, было цёмна, і той я, якога я сябе ўбачыў, мне ня глянуўся, не спадабаўся, і я з радасьцю, з пранізьлівым шчасьцем адчуў сябе другім, зусім іншым, лёгкім, бязважкім — і там, дзе я быў такім, было сьветла, так сьветла, як скрозь і ўва мне адно сьвятло. Шчасьлівым сьвятлом у тым сьвятле я выплыў з бакоўкі, праплыў па чыстай палавіне над сваёй маці, якая спала і ўсьміхалася ў сьне, над сваім бацькам, над усімі роднымі, блізкімі, крэўнымі мне людзьмі, пра якіх думаў, як страшна будзе іх пакідаць, як яшчэ страшней будзе, калі нехта зь іх мяне пакіне, а тут адчуў, што не, зусім ня страшна, і яшчэ адчуў, што хачу пакінуць іх як найхутчэй, зараз, — і мяне неадольна пацягнула ў адчыненую фортку, бо ў хаце было душна і трэба было дыхаць, а за форткай было так высака і прасторна і дыхаць ня трэба было, бо ты сам, як дыханьне, так, як дзіцячае дыханьне, і калі я рвануўся ў фортку, пераўтвараючыся ў дыханьне і набіраючы і набіраючы сьвятла, убачыў за форткай дзеда, які таксама — адно дыханьне і сьвятло, і дзед прадыхнуў: «Тут ня цёмна, ты ня бойся...» — «Дзед!» — кінуўся я да яго, каб маліць, каб заклінаць, каб ён узяў мяне з сабой, — і знайшоўся ў самім сабе ў бакоўцы, дзе ляжаў, склаўшы рукі, на тапчане. Усё скончылася, але ў цела сваё, якое яшчэ трэба было даношваць, я вярнуўся іншым. Не нашмат, ня гэткім, як сьвятло і дыханьне, але і не такім, якім сябе пакідаў... Я дзеда так любіў, ён так мяне любіў, што прыадкрыў таямніцу: сьмерці няма. Няма сьмерці.

Чмель адпусьціў руку вандроўніка, усьміхнуўся і сказаў:

— Дзякуй. А то там сьвятар сядзіць і сядзіць...

— Але гэтага мне мала было, — доўжыў вандроўнік. — Толькі аднаму гэта ведаць было мала, хацелася, каб і маці ведала, і бацька, і ўсе, каго я любіў... I я ўсіх пабудзіў, сказаў, што дзед памёр, і стаў глядзець, што яны стануць рабіць, і калі яны кінуліся з сьлёзамі і крык, загаласілі: а на каго ж ты нас пакінуў? — я ўзмаліў: дзед, падай ім знак, што яно не пра тое плачуць, крычаць і галосяць! I дзед сарваў са сьцяны зашклёны абраз, пад якім памёр, узьняў яго і грукнуў аб падлогу, шкло ў галашэньне і сьлёзы пырскамі разьляцелася: «Сьціхніце! Сьмерці няма!..»

— Абраз гваздануў?.. — напружана ўгледзеўся ў вочы вандроўніка чмель.

— Абраз.

— Пад якім памёр?..

— Пад якім памёр.

— Нахіліся да мяне... — паспрабаваў прыпадняцца чмель і, калі вандроўнік нахіліўся, вышаптаў яму на вуха. — Зрабі так, каб як найцішэй было, калі стану дыханьнем. Пастараешся?..

— Пастараюся, але так ня будзе, — адказаў вандроўнік. — Вы самі ведаеце...

Чмель сказаў:

— На жаль...

Вандроўнік папрасіўся:

— Я пайду?..

— Ідзі... І вяртайся дахаты, — пацалаваў яго чмель. — Доўгім ці кароткім шляхам, але вяртайся.

— Я вярнуся, — сказаў вандроўнік. — Доўгім ці кароткім... — І не дагаварыў, пра нешта падумаўшы.

Бог сказаў: «Кароткага шляху не бывае».

Чмель пачуў. Памаўчаў і кіўнуў, лежачы: «Гэта так».

Вандроўнік рушыў да дзьвярэй, у якіх чмель спыніў яго.

— Чакай. Апошняе... Скажы ім, што хачу памерці ў сваім ложку.

— А самі вы...

— Казаў. Ня чуюць... Баяцца, што памру.

Вандроўнік кіўнуў і выйшаў.

— Ну што?.. — кінуўся на калідоры да вандроўніка сьвятар, і вандроўнік зманіў:

— Не разумее.

— Ён хоча памерці ў сваім ложку, — сказаў вандроўнік доктару, і той адказаў:

— Ведаю.

— Тады чаму не?..

— Бо ён штучна жыве. I калі я адключу яго ад штучнага жыцьця, памрэ ці імгненна, ці па дарозе ў машыне. Што мне рабіць?..

Вандроўнік павагаўся і сказаў:

— Адключы. Ён не памрэ па дарозе.

Доктар бясьсільна разьвёў рукамі:

— Я доктар. I чужы, як і ты. Няхай яговыя скажуць...

— А што яны?..

— Ня чуюць. Баяцца, што памрэ.

Вяртаючыся дахаты, вандроўнік у каторы раз намагаўся ўцяміць: хто такі чмель і што такое Бог?.. Калі Бог, думаў вандроўнік, у якога чмель ня верыць, усё адно ў чмялі — значыць, Бог ва ўсіх. Як душа, якая і ёсьць чмель, і ёсьць Бог. Якія адначасова і паўсюдна ва ўсім гэткім бясконцым, што немагчыма ўявіць, Сусьвеце... Дзе штоімгненна запальваюцца і пагасаюць у нечым лятучым, што ляціць і ўніз, і ўверх, і адразу ва ўсе бакі, мільярды мільярдаў зорак, і маленькая лятучая душа роўная ўсяму бясконцаму лятучаму Сусьвету, у якім ад бясконцасьці да бясконцасьці — усё адно ў адным, і ўсё гэта разам і ёсьць Бог...

Мудрасьці, каб падумаць інакш, не хапіла. Вандроўнік зразумеў, што ў тым, пра што падумаў, няма мудрасьці. «Тады дзе яна і ў чым?...»

Выходзіла, што калі ня ў ім, у вандроўніку, тады ў вандроўным Богу.

Тут узьнікала праблема...

Богу было не да авадня — і авадзень не памёр. У ім замянілі ўсё аваднёвае на новае, і ён далей застаўся жыць і баяцца памерці...

Чмель памёр у шпіталі ў той дзень, у які некалі пачалася вайна, на якой пражыў ён жыцьцё. Сьвятара ён так і не паклікаў, але Бог, які быў у чмялі, пахаваньне ягонае наладзіў, як сьвята... Было бясконца ціха — сьвятло і дыханьне, і ў сьвятле і дыханьні луналі белыя сьцягі з чырвонымі сьлядамі крывінак.

І нікога на машынах, каб пылу не ўздымалі...

Вандроўнік ішоў за трунай і ўспамінаў, як маліў чмяля, калі той памёр, каб падаў які-небудзь знак, што ўсё тое, пра што яны апошнім разам гаварылі, так і ёсьць, і як чмель падаў знак: калі ўсчаўся гвалт і крык, падняў свой зашклёны партрэт, бо абраза не было, і гваздануў яго аб падлогу, шкло пырскамі ў крык і гвалт разьляцелася: «Сьціхніце!..» І яшчэ згадаў вандроўнік, як пад клявіятурай друкарскай машынкі, якая дасталася яму ад чмяля, знайшоў прыклееную паперынку, на якой чмялём было напісана:

*«Ёсьць першая старонка... З Богам!»*


# *Кнігі поштай*



НОВАЕ

| | |
|---|---|
| **ЖЫБУЛЬ Віктар. Дыяфрагма.** Збор вершаў. 112 с. | 3500 |
| **ДАРАФЕЙЧУК Ірына. Паганскае кола.** Вершы. 84 с. | 2000 |
| **АНТАЛЁГІЯ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА МЫСЬЛЕНЬНЯ.** 496 с. | 4600 |
| **ХАДАНОВІЧ Андрэй. Старыя вершы.** 120 с. | 3500 |
| Vostraja Brama 1: **БЫКАЎ Васіль. Пахаджане.** 192 с. | 5000 |
| **САГАНОВІЧ Генадзь. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII стагодьдзя.** 412 с. | 7000 |
| **САГАНОВІЧ Генадзь. Невядомая вайна: 1654—1667.** 144 с., цьвёрдая вокладка. | 2800 |
| Vostraja Brama 7: **АРЛОЎ Уладзімер. Адкусі галаву вароне**. 176 с. | 5600 |
| **ДЗЕЯСЛОЎ 2003. №4.** 256 с. | 4000 |
| **ARCHE-Пачатак 2003. №3**. 240 с. Тэма нумару – «Pax Americana». | 2200 |
| **ЛЕСКЕЦЬ Сяргей. Гасьцінец.** 48 с. | 1400 |
| **ЦІХАНАВА Ганна. Фільтры сноў.** 126 с. | 3500 |
| **НАША НІВА. 1911 г. Выпуск 4. Факсымільнае выданьне.** 684 с. | 10000 |
| **СПАДЧЫНА 2002. №4.** 96 с. | 4500 |
| **СУІНДЖВУД Элан. Сьціслая гісторыя сацыялягічнай думкі.** 349 с. | 1800 |
| **УРБАН Паўла. Старажытныя ліцьвіны. Мова, паходжаньне, этнічная прыналежнасьць.** 261 с. | 4400 |

***

| | |
|---|---|
| **150 ПЫТАНЬНЯЎ І АДКАЗАЎ З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ.** 238 с., цьвёрдая вокладка. | 10000 |
| **ARCHE-Пачатак 2002. №1.** 184 с. | 1500 |
| **ARCHE-Пачатак 2002. №2.** 256 с. Тэма нумару – «Нашы дзеткі». | 1900 |
| **ARCHE-Пачатак 2002. №3.** 296 с. Тэма нумару – «Андрэй Хадановіч» | 2000 |
| **ARCHE-Пачатак 2003. №1.** 208 с. Тэма нумару – «Расейскае пытаньне». | 2000 |
| **ARCHE-Пачатак 2003. №2**. 200 с. Тэма нумару – «Туманнасьці беларускай гісторыі». | 2000 |
| **CASTRUM, URBIS ET BELLUM.** Зборнік навуковых прац. 422 с., цьвёрдая вокладка. | 6000 |
| **MARA Алесь. Аўтаманаграфія.** 168 с. | 25000 |
| Vostraja Brama 0: **ГЛЁБУС Адам. Post Scriptum**. 176 с. | 3000 |
| Vostraja Brama 3: **ЛУКАШУК Аляксандар.** У фіялетавай ночы вугал крыла. 160 с. | 3000 |
| Vostraja Brama 4: **БАРТОСІК Зьміцер. Чорны пісталет.** 240 с. | |
| Vostraja Brama 5: **Глёбус Адам. Браслаўская стыгмата.** 192 с. | 3000 |
| **АРЛОЎ Уладзімер, ГЕРАСІМОВІЧ Зьміцер. Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя.** 320 с., цьвёрдая вокладка. | 40000 |
| **АРЛОЎ Уладзімер, САГАНОВІЧ Генадзь. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі.** | 7000 |
| **АРЛОЎ Уладзімер. Ордэн Белай Мышы: Аповесьці, апавяданьні.** 301 с. | 3800 |
| **АДАМОВІЧ Алесь. VIXI.** 502 с. Тры апошнія аповесьці. | 12600 |
| **АДАМОВІЧ Славамір. Турэмны дзёньнік. Дакумэнты, дзёньнікі, вершы.** 160 с. | 3800 |
| **АДАМЧЫК Вячаслаў. Нязрушаны камень.** 320 с., цьвёрдая вокладка. | 3000 |
| **АСТРАВЕЦ Сяргей. Цэнзарскія нажніцы.** 546 с. | 5600 |
| **АСТРАЎЦОЎ Сяргей. Лісты да гома саветыкуса.** 300 с. | 4200 |
| **БАРАДУЛІН Рыгор. Лісты ў Хельсынкі.** 84 с. | 1000 |
| **БАРЫСЕВІЧ Юрась. Alter Nemo.** 136 с. | 3500 |
| **БАБКОЎ Ігар. Адам Клакоцкі і ягоныя цені.** 110 с. | 4200 |
| **БАБКОЎ Ігар. Герой вайны за празрыстасьць.** 92 с. | 2100 |
| **БАШУРА Міхась. Паліваньне на мух са шланга.** 64 с. | 1000 |
| **Беларуска-расійская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы.** 424 с. | 3000 |
| **Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001 г.** 480 с. | 3000 |
| **Беларускі гістарычны агляд. Том 8.** Сшытак 1—2 (14—15). 384 с. | 3500 |
| Беларускі кнігазбор т.19: **Натальля АРСЕНЬНЕВА. Выбраныя творы.** 592 с. | 4700 |
| **Беларускі малітаўнік.** 784 с., цьвёрдая вокладка. Укладзены Аляксандрам Надсанам. | 6000 |
| **Беларускія маршы і песьні.** 62 с. Зборнік патрыятычных песень з нотамі. | 2000 |
| **БЕЛАРУСЬ. Фотаальбом.** 50 с., цьвёрдая вокладка. | 19000 |
| Біб-ка БГА 10: **ЮРЭВІЧ Лявон. Літаратурны рух на эміграцыі.** 244 с. | 4200 |
| Біб-ка БГА 3: **БЕЛЫ Алесь. Хроніка Белай Русі.** 238 с. | 4200 |
| Біб-ка БГА 9: **ТУМАШ Вітаўт. Выбраныя працы.** 246 с. | 3500 |
| **БІБЛІЯ.** Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету ў беларускім перакладзе Васіля Сёмухі. 1536 с., цьвёрдая вокладка. | 18000 |
| **Быць альбо ня быць сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысленьне.** | 1800 |
| **ВАЛЬЕХА Сэсар. Чорныя геральды.** Выбраная лірыка. 143 с., цьвёрдая вокладка. | 1900 |
| **ГАПЕЕВА Вольга. Рэканструкцыя неба.** 142 с. | 3500 |
| **ГЕЛАГАЕЎ Алесь. Беларускія нацыянальныя вайсковыя фармацыі ў часе Другое сусьветнае вайны.** 72 с. | 2000 |
| **ДРАЗДОВІЧ Язэп. Альбом-манаграфія.** 180 с., цьвёрдая вокладка. | 25000 |
| **ДАМІНІКА 2002. №1.** 28 с. Беларускі часопіс для маладых сем’яў. | 1200 |
| **ДАМІНІКА 2003. №2.** 48 с. Беларускі часопіс для маладых сем’яў. Другі нумар. | 4900 |
| **ДЗЕЯСЛОЎ 2003. №2.** 256 с. Літаратурна-мастацкае і публіцыстычнае выданьне. | 4000 |
| **ДЗЕЯСЛОЎ 2003. №3.** 256 с. | 4000 |
| **ДУБАВЕЦ Сяргей. Дзёньнік прыватнага чалавека.** 80 с. | 1500 |
| **ЗАПІСЫ БЕЛАРУСКАГА ІНСТЫТУТУ НАВУКІ І МАСТАЦТВА 2003. №26.** 224 с. | 3100 |
| **Зямля N. 2002. №1.** 80 с. | 4200 |
| **ЗЯНОН. Глёрыя Патрыя.** 350 с., цьвёрдая вокладка. | 24000 |
| **КАВАЛЬ Ян. Генэрал вызвольнага фронту.** 40 с. | 2000 |
| **КАПА Натальля. Бэзавыя дрэвы.** 90 с. | 2000 |
| **КАТКОВІЧ Анеля, КАТКОВІЧ-КЛЕНТАК Вэраніка. Успаміны.** 142 с. | 5000 |
| **КІСЬЛІЦЫНА Ганна. BLONDE ATTAK.** 144 с. | 3500 |
| **КОТЛЯРЧУК Андрэй. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў.** 296 с. | 2500 |
| **КРАЎЦЭВІЧ Аляксандар. Стварэньне Вялікага Княства Літоўскага.** 240 с. | 4200 |
| **ЛАГОДНЫ ЦМОК.** Зборнік ангельскіх літаратурных казак. 120 с., цьвёрдая вокладка. | 1000 |
| **МАРАКОЎ Леанід. 100 мініяцюр.** 236 с. Пра жыцьцё, сьмерць і каханьне. | 5900 |
| **МІЛАШ Чэслаў. Скуты розум.** 246 с. | 4200 |
| **МІНСКЕВІЧ Серж. Мінскія/Менскія санэты.** 60 с. | 2800 |
| **НАЦЫЯНАЛІЗМ У СЬВЕЦЕ (частка другая).** 54 с. | 1400 |
| **НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПАКЛІКАНЬНЕ.** 24 с. | 1400 |
| **НАША НІВА. 1910 г. Выпуск 3. Факсымільнае выданьне.** 800 с. | 10000 |
| **НІСБЭТ Робэрт. Кансэрватызм: мара і рэальнасьць.** 136 с. | 3000 |
| **ПАДБЯРЭСКІ Зьміцер. Саксафон Чынгісхана.** 414 с. | 3500 |
| **ПАЛІТАЛЁГІЯ. Асноўны курс.** 680 с. | 3600 |
| **ПАМІЖ №2.** 170 с. | 2800 |
| **ПЕСЬНІ КРАЮ. Сьпеўнік.** 32 с. | 2000 |
| **РАМАНЮК Міхась. Беларускія народныя крыжы.** 222 с., цьвёрдая вокладка. | 55000 |
| **СВАБОДА БЕЗЬ ЦЯБЕ.** 146 с. | 2700 |
| **СІЛЬНОВА Людка. Зеленавокія вої і іх прыгажуні.** Вершы з прысьвячэньнямі. 72 с. | 2000 |
| **СКОБЛА Міхась: Краса і сіла. Анталёгія беларускай паэзіі XX стагодзьдзя.** 880 с., цьвёрдая вокладка. | 21000 |
| **СПАДЧЫНА 2002. №2-3.** 224 с. | 2900 |
| **СТАНКЕВІЧ Вячка. Я магу жыць лепей.** + Відэакасэта. | 13500 |
| **СТАНКЕВІЧ Ян. Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік.** 1305 с. | 22 000 |
| **СТАНКЕВІЧ ЯН. Збор твораў у 2-х тамах.** 1-шы 552 с., 2-гі 586 с. | 9000 |
| **СТУЖЫНСКАЯ Ніна. Беларусь Мяцежная. З гісторыі антысавецкага ўзброенага супраціву. 20-я гады XX стагодзьдзя.** 256 с. | 15000 |
| **СЬЦЯЦКО Павал. Культура мовы.** 444 с., цьвёрдая вокладка. | 4700 |
| Сэрыя Schmerzwerk: **БАХАРЭВІЧ Альгерд. Практычны дапаможнік па руйнаваньні гарадоў.** | 2100 |
| Сэрыя Schmerzwerk: **ВІШНЁЎ Зьміцер. Трап для сусьліка альбо нэкрафілічнае дасьледаваньне аднаго віду грызуноў.** 152 с. | 4200 |
| Сэрыя Schmerzwerk: **ВІШНЕЎ Зьміцер. Тамбурны маскіт.** 256 с. | 3800 |
| Сэрыя Schmerzwerk: **СІН Ільля. Нуль.** 108 с. | 2100 |
| **ТАРАСАЎ Кастусь. Беларусь. Гістарычнае падарожжа для дзяцей.** 112 с. | 8400 |
| **ТОЛКІН Дж. Р. Р. Хобіт, або Вандроўка туды і назад.** 264 с. | 5600 |
| **ФРАГМЭНТЫ №6 (1-2’99),** 302 с. Альманах філязофіі, культуралёгіі і літаратуры. | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №7 (3-4’99),** 288 с. Тэма нумару: «Беларусь: крытычнае мысленьне». | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №8 (1-2’00),** 308 с. Тэма нумару: «Ідэя свабоды». | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №9 (3-4’00),** 304 с. Тэма нумару: «Эўропа і яе Іншыя». | 4200 |
| **ФРАГМЭНТЫ №10. БАБКОЎ Ігар. Філязофія Яна Сьнядэцкага.** 136 с. | 4200 |
| **ХАРЭЎСКІ Сяргей. Зьвяры-суайчыньнікі.** 92 с. | 700 |

ВІДЭА

| | |
|---|---|
| **АЛІСА Ў КРАІНЕ ЦУДАЎ.** Мультфільм 75 хвілінаў. | 4900 |
| **БОЛТА.** Мультфільм 87 хвілінаў. | 4900 |
| **ГІСТОРЫЯ ЦАЦАК.** Мультфільм 75 хвілінаў. | 4900 |
| **ГЛЯДЫЯТАР.** Гістарычная драма 154 хвіліны. | 4900 |
| **ДЫНАЗАЎР.** Мультфільм 82 хвіліны. | 4900 |
| **ЖЫЦЬЦЁ ЖУКОЎ.** Мультфільм 95 хвілінаў. | 4900 |
| **ЛЭДЗІ Й ВАЛАЦУГА II.** Мультфільм 70 хвілінаў. | 4900 |
| **МАЛЕНЬКІ СЬЦЮАРТ.** Мастацкі фільм 84 хвіліны. | 4900 |
| **МЕЧ У КАМЯНІ.** Мультфільм 88 хвілінаў. | 4900 |
| **ПРЫГАЖУНЯ Ў СОННЫМ ЛЕСЕ.** Мультфільм 75 хвілінаў. | 4900 |
| **ПРЫГОДЫ ВІНІ ПУХА.** Мультфільм 79 хвілінаў. | 4900 |
| **ПАКАХОНТАС II: ПАДАРОЖЖА Ў НОВЫ СЬВЕТ.** Мультфільм 73 хвіліны. | 4900 |
| **ПАН ТАДЭВУШ.** Мастацкі фільм 150 хвілінаў. | 5300 |
| **РУСАЛАЧКА II: ВЯРТАНЬНЕ Ў МОРА.** Мультфільм 75 хвілінаў. | 4900 |
| **СЬЛЁЗЫ БЛУДНАГА СЫНА.** 0:38 хвілінаў. **САЛОДКІ ЯД КАХАНЬНЯ.** 0:48 хвілінаў. | 4900 |
| **ТАРЗАН.** Мультфільм 88 хвілінаў. | 4900 |
| **ШРЭК.** Мультфільм 90 хвілінаў. | 4900 |

Атрымаць кнігі можна таксама і накладзеным плацяжом (далей — НП), г. зн. аплата — па атрыманьні на пошце. Для гэтага трэба даслаць ліст з замовай на адрас: **п/с 333, 220050, Менск** (без пазнакі «Кнігі — поштай»), пазначыўшы сваё ймя, імя па бацьку, прозьвішча і падрабязны адрас (для хуткасьці — тэлефон, e-mail, пэйджэр). Пры дасылцы НП зьніжкі ня дзейнічаюць. Цэны ў каталёгу — для Менску. Для рэгіёнаў зьніжка 10% (толькі пры перадаплаце). Замову можна даслаць на e-mail **EXLIBRIS@TUT.BY** ці патэлефанаваць **(029) 643-57-33**. Поўны каталёг з анатацыямі і вокладкамі глядзіце на сайце **http://exlibris.cjb.net**.

## ТЫДЗЕНЬ У АСОБАХ

**Імя былога шэфа КДБ Уладзімера Мацкевіча** зноў загучала ў газэтах, пасьля таго як усплыла копія ягонага рашэньня аб арышце камандзіра ЗАХРу Паўлічэнкі па падазрэньні ў шэрагу гучных забойстваў. Цікава, што гэта адбылося неўзабаве пасьля нечаканага аднаўленьня крымінальнае справы па факце зьнікненьня вядомых палітыкаў.

Міністар энэргетыкі **Ўладзімер Сямашка** прызначаны в.а. першага віцэ-прэм'ера на месца Сідорскага, а на ягонае крэсла ў Мінэнэрга прызначаны 63-гадовы кандыдат на пэнсію Эдуард Таўпянец. Ціхі Сямашка, здаецца, далёка пойдзе.

**Мэр Менску Паўлаў** сьвяткуе перамогу. Нарэшце ў мэтро замест «Плошча Незалежнасьці» кажуць «Плошча Леніна». З Днём акцябарскай рэвалюцыі Вас, тавары ш!

**Аляксандар Вайтовіч** раптоўна дасягнуў «крытычнага ўзросту» і перастаў быць сьпікерам палаты.



І нават ня пікнуў. Мог бы хоць назваць рэчы сваімі імёнамі пры канцы свайго доўгага і вернага працоўнага шляху. Ходзяць чуткі, што Вайтовічу паабяцанае крэсла прадстаўніка Беларусі пры ААН.

**Аляксандар Ладзята**, дырэктар Нясьвіскай друкарні, стаіць на мяжы звальненьня за тое, што надрукаваў «Местную газету» з матэрыяламі журналістаў «БДГ». Менш пашанцавала дырэктару Слонімскай друкарні **Анатолю Лагуціку.** У выніку прыменены х да яго мераў ён апынуўся ў шпіталі пад кропельніцай.




СЯРГЕЙ МАЗАНІК

**Злева направа: Станіслаў Архіпаў, Уладзімер Кокараў, Вікторыя Лебедзь, Ігар Хрол, Канстанцін Пашковіч**

**Вікторыя Лебедзь**, вучаніца Ліцэю БДУ, атрымала залаты мэдаль на міжнароднай матэматычнай алімпіядзе ў Токіё. Срэбра ўзялі ліцэіст Канстанцін Пашковіч і Ігар Хрол з Магілёва, бронзу — Станіслаў Архіпаў зь Віцебску і ліцэіст Уладзімер Кокараў (гл. фота зьверху). Віншаваньні Ліцэю БДУ.

**Аляксандар Лукашэнка** зацьвердзіў закон пра вайсковы абавязак, які прадугледжвае службу ў рэзэрве — такога няма больш нідзе ў СНД. На такую службу будуць накіроўвацца «высокакваліфікаваныя кадры, дзеячы навукі, культуры, мастацтва і спорту». Вайсковы абавязак перастае быць усеагульным, але войска прафэсійным пакуль ня робіцца.

**Падначаленыя Анатоля Куляшова**, начальніка менскай міліцыі, будуць цягам месяца шукаць у дварах кінутыя аўтамабілі ў аварыйным стане і завозіць іх на ўтылізацыю. Пасьля савецкіх піянераў гэтай карыснай справай ніхто не займаўся.

**Мірон Касма,** лідэр румынскіх шахцёраў, атрымаў 18 гадоў турмы за арганізацыю антыўрадавых акцыяў пратэсту. Нават савецкія дысыдэнты не атрымлівалі такіх суровых пакараньняў. Румынскія дэмакраты нікому не дазволяць замахвацца на дэмакратычны лад!

**Майкл Джэксан** выступіў супраць суровых антыпірацкіх законаў, якія зьбіраецца прыняць амэрыканская ўлада. Сьпявак лічыць, што турма за спробу сьцягнуць з Інтэрнэту музыку — гэта занадта. Сапраўды, занадта.

**Мэр Атэнаў Дора Бакаяніс** плянуе напярэдадні Алімпіяды выдаць ліцэнзіі 230 публічным дамам. Гэтае рашэньне абурыла Грэцкую праваслаўную царкву і шэраг эўрапейскіх інстытуцыяў, якія абараняюць роўнасьць палоў. Незадаволеныя і прастытуткі, але з процілеглых меркаваньняў. Цяпер у Атэнах 600 нелегальных бардэляў, а налета будзе ўсяго 230 «законных».



**Грымасы глябалізацыі: Джон Говард**, прэм'ер Аўстраліі, прапанаваў астраўным дзяржавам Акіяніі аб'ядначацца, бо паасобку яны «не да канца жыцьцяздольныя». Астраўляне Тувалу, Тонгі і іншых Фіджаў затаілі крыўду.

**Сяргей Мікулевіч**

# Чутка тыдня

**На мінулым тыдні ў Жлобіне на мэталюргічным заводзе кранаўшчык загружаў у 80-тонную скрыню з мэталаломам, што мусіць ісьці на пераплаўку, вялікі сэйф.** Раптам адтуль пасыпаліся даляры. Рабочыя, хто бачыў, кінуліся расьпіхваць іх у кішэні. Некаторыя panaбіралі па 15 тысячаў. А на выходных здавалі падпсаваныя купюры валютчыкам — па 30 тыс. за 50-даляравую паперку. Сэйф той, кажуць, прывезьлі з Расеі.



ВЫНІКІ КОНКУРСУ «НН»

# Чароўная Панна/Ала Жаніхоў Зазывала, Броўкі Сабе Фарбавала

Гэтая спэктральная памятка — пераможца конкурсу на найлепшую фразу — нагадку колераў спэктру. Журы конкурсу (паэт Міхась Скобла, выкладчык фізікі Ўладзімер Анцулевіч і мовазнавец Зьміцер Саўка) вызначыла наступныя крытэры ацэнкі памятак:

— запамінальнасьць (прысутнасьць рытму, пажадана, каб памятка рыфмавалася, не павінна быць неабавязковых або выпадковых элемэнтаў);

— прастата й яснасьць (адсутнасьць складаных словаў і рэдкаўжывальных формаў);

— дасьціпнасьць;

— пісьменнасьць, або фармальная правільнасьць з гледзішча мовы (ня можа быць памылак словазьмяненьня ці словаўжываньня; фраза павінна быць правільна збудаваная);

— фармальная лягічнасьць;

— «амбівалентнасьць» (наяўнасьць элемэнта на **п-** (**п**амаранчавы), які можа замяняцца элемэнтам на **а-** (**а**ранжавы), каб памятка магла выкарыстоўвацца ў сёньняшняй школьнай практыцы);

— карэктнасьць, маральнасьць, пэдагагічнасьць, агульная «станоўчасьць», адсутнасьць непажаданай двухсэнсоўнасьці;

— апалітычнасьць.

Такою патрабавальнасьцю да сямісл оўнай фразы тлумачыцца факт, што ніводная з прапанаваных памятак не адпавядала ўсім пералічаным крытэрам. Нават у фразе-пераможцы быў элемэнт, які журы дазволіла сабе замяніць на іншы, бо мэта конкурсу — ня выявіць найбольш уметнага складальніка, а прапанаваць школьнікам і настаўнікам добрую спэктральную памятку.

Усе пераможцы атрымліваюць прызы — кнігі з аўтографамі аўтараў:

Першае месца — **Антон Бубала** зь Верхнядзьвінску. Прыз — кніга У.Арлова й З.Герасімовіча «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя».

Другое месца — **Алесь Капёнкін** (**Ч**ароўныя **П**есьні/**А**рыі **Ж**аваронка **З**амінаюць **Б**адзёраму **С**кладаньню **Ф**ормул). Прыз — кніга В.Кіпеля і З.Саўкі «Беларускія слоўнікі й энцыкляпэдыі».

Трэцяе месца — **невядомы аўтар** (**Ч**аго **П**рынесьці/**А**днесьці **Ж**эўжыку **З**ьесьці? — **Б**ульбы, **С**ала, **Ф**асолі) — кніга М. Скоблы «Дзярэчынскі дыярыюш».

Як бачым, сярод пераможцаў — невядомая асоба. Спадзяемся, яна адгукнецца. Маем надзею, што прыз знойдзе і А. Капёнкіна. Нагадаем, што ягоную памятку на конкурс даслаў Міхась Булавацкі, які й сам ня мае кантакту з былым вучнем і ня ведае, дзе той цяпер. Таму — Алесь, адгукніцеся!

По даручэньні журы,

**Зьміцер Саўка**

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

ЦЫТАТНІК

# Гаворыць ГУУС...

З 2000 году ў беларускай міліцыі створаныя аддзелы нораваў і незаконнага абароту наркотыкаў, якія маюць асаблівы статус. На першы погляд можа падацца: што абагульняе наркотыкі і прастытуцыю. Але вось статыстыка: наркаман можа «пасадзіць на іголку» 5-6 чалавек, і столькі ж дзяўчат адна прастытутка можа ўцягнуць у свой занятак.

**www.guvd.gov.by**

# Біблійная сэлектарная нарада

У Бібліі сказана, што перад сусьветным патопам Ной сабраў прадстаўнікоў усіх жывёлаў на свай каўчэг.

**«Советская Белоруссия»**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Прыўкрасная Юлія Кручыніна**, я цябе вельмі моцна кахаю. Ты — сама прыгажосьць! Інкогніта

**Віншую** Андруся Дзенісевіча з Днём народзінаў. Зычу посьпехаў у працы і моцнага здароўя. Skarbnik

**З народзінамі** цябе, наша любая Аўгіньня Гучак, сьветлага жыцьця ў свабоднай краіне. Ю.Гучак

**Віншуем** блакітнавокую Аўгіньку Гучак з 14-годзьдзем. Жадаем пасьпяховага жыцьцёвага шляху. Палашчанкі

**Даражэнькая Алёнка!** Я забыўся сказаць, што кахаю цябе. Астраном

**Алеся Бельскага віншую** з чарговым дзесяцігодзьдзем! Сьветлай сонечнай будучыні, спагаднага зорнага неба над галавой. Хай спрыяе табе Бог, хай збудуцца ўсе твае жаданьні і мары. Міхась

**Аляксандру Прыгодзіч** зь вёскі Лышча Пінскага раёну віншуем з Днём народзінаў! Жадаем моцнага здароўя і ўсяго найлепшага. Лебедзі

### КАНТАКТЫ

**Цэнтар вывучэньня** skinheads. E-mail: center14@tut.by

**Вясёлку мне!** Хоць кавалачак вясёлкі! Ну, калі ласачка... А то ўсё загіне. У.Караткевіч

**Танечка Сулімава**, як з такою песьняй, дык лепей ужо б зусім не віншавала. Сэрж

**Бясплатна** вышлю як zip або doc Сьпіс беларускіх навуковых назваў 638 птушак Эўропы (лаціна — расейская — беларуская). Harrier@tut.by

**Малады Фронт**! www.mfront.org. Т.: 8-029-755-69-90, 211-00-00, аб.89545. Жыве Беларусь!

**У суботы** Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя ладзіць талокі ў Курапатах. Запрашаем усіх ахвотных, з сабою мець рыдлёўку

### КНІГІ

**Кнігі**, CD, аўдыё, відэа ў Гомелі на пл.Паўстаньня да 13.00. Т.: 45-11-51, 632-88-52 (толькі SMS)

**Прадаю** частку бібліятэкі — кнігі пераважна беларускія. Каб атрымаць сьпіс, дашліце капэрту. А/с 120, 220030, Менск

**Набуду** ўсе нумары «Палітычнай сфэры» і «Згоды» ад траўня б.г. Аплату гарантую. І «Мэтрыку ВКЛ». Адам Міцкевіч, в.Школьная, 2а, 222201, Смалявічы

### ПАКОЙ

**Здыму пакой** у цэнтры ўздоўж лініі мэтро. Своечасовасьць аплаты і парадак гарантую. Т.: 214-42-14, 213-30-29

### РОВАР

**Прадам ровар** спартовы «Старт-шаша» (б/в, неабходны дробны рамонт), за 15$. Т.: 220-25-77

### СПАЧУВАНЬНІ

**Ніна Гілевіч** (1931—2003) была сьветлай беларускай жанчынаю: шчырай, мудрай, вернай. Сваёй цьвёрдай, моцнай вераю дзялілася з намі. Гаварыла пра мову. Вучыла культуры. Клапацілася. «Мае вы галубкі», – яе словы, зьвернутыя да нас. Будзем памятаць. Вучні

**Народнаму Паэту Нілу Гілевічу** спачуваньні ад усяе нашае грамады ў вялікім горы — страце спадарожніцы жыцьця. Страты незваротныя, жыцьцё ня вечнае, але сьмерць ня ўсё забірае. «Я ня дрэвам, дык хоць кветкай прарасту...» Берасьцейцы

! Толькі да жніўня ЗЬНІЖКА
на відэакасэты **«Пан Тадэвуш»**
на 1000 рублёў. А/с 150, 220107,
Менск. Пэйдж.: 211-85-85, аб.25402.
E-mail: belvidea@hotmail.com

### Адказы на крыжаванку з №27

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** 1. Месяц. 4. Дэфолт. 9. Вальтэр. 10. Атрыбут. 13. Алё. 14. Фал. 15. Каліна. 16. Паранджа. 17. Прастата. 19. Ліда. 21. Рукапіс. 24. Віно. 26. Эпітафія. 28. Дылетант. 31. Таідзэ. 32. Іён. 34. Рум. 35. Пераказ. 37. Ірванец. 38. Каптур. 39. Бляха.

**ПА ВЭРТЫКАЛІ:** 1. Мамант. 2. Сьвёкар. 3. Торф. 5. Фры. 6. Татэм. 7. Цьвінтар. 8. Кальрабі. 11. Ручнік. 12. Баржомі. 16. Парапэт. 18. Ага. 20. Дырыжор. 22. Урбанізм. 23. «Сотнікаў». 24. «ВЭФ». 25. Клецак. 27. Інэрцыя. 29. Гамора. 30. Гапак. 33. «Ніва». 36. Акт.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
галоўны рэдактар Андрэй Дынько
выпускны рэдактар Сяргей Ёрш
карэктар Сяргей Петрыкевіч
карэктарка Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3468. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.07.2003.

Замова № 3900.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а